

ХВАРОБУ ЛЕПШ ПАПЯРЭДЗІЦЬ 12

ХЛЕБА? І... ВЕРШАЎ! 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

1 САКАВІКА 2023 г.
СЕРАДА
№ 40 (29920)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Валерый КАВАЛЬКОЎ, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:**

*«2023 год не будзе моцна адрознівацца ад 2022-га, прыярытэты застануцца тыя ж — як у эканамічнай, так і ў сацыяльнай сферы. У першую чаргу гэта забеспячэнне росту заработнай платы, даходаў нашых грамадзян, устойлівае функцыянаванне рынку працы. Мы не павінны дапусціць росту беспрацоўя. У сацыяльнай сферы ў прыярытэце застанецца забеспячэнне ўсімі сацыяльнымі выплатамі. Пенсіі і дапамогі будуць выплачвацца своечасова і ў поўным аб'ёме. Мы павінны разумець, што ў нас каля чвэрці насельніцтва — пенсіянеры. Для большасці з іх пенсія з'яўляецца адзінай крыніцай даходаў. Сямейнымі дапамогамі ахоплены 400 тысяч дзяцей, у нас кожнае чацвёртае дзіця атрымлівае той ці іншы від падтрымкі. Таксама ў краіне ў стацыянарных формах і ў нестацыянарных аказваюцца сацыяльныя паслугі. Функцыянуюць дамы-інтэрнаты рознай накіраванасці, дарослыя і дзіцячыя».*

# МУЖЧЫНСКАЕ ВЫХАВАННЕ



Фота БелТА.

Дзяніс МАКСІМЕНКА — адзіны ў Нараўлянскім раёне мужчына-выхавацель у дзіцячым садку. Такую нетыповую для хлопца прафесію Дзяніс выбраў дзякуючы сваёй маме, якая каля трыццаці гадоў працуе з дзеткамі. Ён скончыў педагагічны каледж у Гомелі, цяпер працуе выхавацелем у санаторным дзіцячым садку № 3 Нароўлі. Дзяніс вучыцца завочна ў Мазырскім педуніверсітэце, дзе, дарэчы, у групе сярод 29 дзяўчат ён адзіны хлопец.

Актуальна

## САМІ БУДЗЕМ СЫТЫЯ І СУСЕДЗЯЎ НАКОРМІМ

**Летась экспарт нашага харчавання дасягнуў рэкордных вынікаў і склаў 8,3 мільярда долараў**



**Развіццё аграпрамысловага комплексу ўваходзіць у лік прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі краіны. Сёння ў сельскай мясцовасці пражывае 22 % насельніцтва краіны. У сельскай гаспадарцы працуе каля 7 % ад занятых у рэальным сектары эканомікі. Але па вытворчасці большасці відаў сельгаспрадукцыі на душу насельніцтва мы істотна пераўзыходзім многія краіны і занялі ў 2021 годзе ў рэйтынгу глабальнай харчовай бяспекі 36-е месца сярод 113 дзяржаў. У мінулым годзе мы не толькі забяспечвалі сябе прадуктамі харчавання, але і рэалізавалі значны экспартны патэнцыял.**

### Мінулы год стаў рэкордным

Экспарт харчовых тавараў і сельскагаспадарчай сыравіны ў 2022 годзе склаў больш за 8 мільярдаў долараў. Гэта практычна на чвэрць больш, чым у папярэднім годзе. У 2021-м краіна экспартавала такой прадукцыі на 6,7 мільярда. **Намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Вадзім ШАГОЙКА** расказаў, за кошт чаго ўдалося дасягнуць такіх вынікаў.

СТАР. 5

Час маладых

## НАШ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫ НАБЫТАК

### 100 ідэй для Беларусі. Што можна было ўбачыць у гранд-фінале

**129 аўтарскіх распрацовак у 10 намінацыях былі прадстаўлены ў гранд-фінале Рэспубліканскага маладзёжнага праекта «100 ідэй для Беларусі», які прайшоў у сценах Нацыянальнай бібліятэкі: сярод іх — разумная сонечная панэль, устройства перапрацоўкі пластыку для 3D-друку, сэнсарныя акуляры для людзей з аслабленым зрокам, нейрасетка для класіфікацыі новаўтварэнняў скуры, новыя супрацьпухлінныя агенты для лячэння раку малочнай залозы, водарастваральныя нанавалакністыя матэрыялы для медыцыны і касметалогіі, матэрыялы для рамонту дарог DakPatch, акустычны вогнетушыцель, аркестр LEGO-робатаў для навучання робататэхніцы, беларускамоўны галасавы памочнік «Ясь», праект «Лялька.бай», фэнтэзійная інтэрактыўная навела для навучання геаграфіі «Захавальнік стыхій» і многія-многія іншыя.**



Фота Лізаветы ГОПАД.

СТАР. 3

КОРАТКА

- **Летась грамадзяне Беларусі ўсынавілі 438 дзяцей.**
- Пагашэнне крэдыту на будаўніцтва БелАЭС будзе адтэрмінавана на год.
- **Беларускія прадпрыемствы на выстаўцы ў Дубаі заключылі дагаворы на больш як $4 млн.**

ISSN 1990 — 763X
23040

З першых вуснаў

# «РЭДКА З ЯКОЙ ДЗЯРЖАВАЙ КІТАЙ МАЕ ТАКІ ЎЗРОВЕНЬ СУПРАЦОЎНІЦТВА. МЫ ГЭТА ВЕЛЬМІ ЦЭНІМ»

**Учора ўвечары Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыбыў з дзяржаўным візітам у Кітай. Гэты візіт — працяг шматгадовага курсу на выбудоўванне адносін дружбы і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з Кітайскай Народнай Рэспублікай. У верасні 2022 года на двухбаковай сустрэчы на палях саміту Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва лідары Беларусі і Кітая прынялі сумесную дэкларацыю аб вывадзе адносін на новы ўзровень — усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства.**

**Аналіз дасягнутага і максімальная рэалізацыя на практыцы патэнцыялу новага ўзроўню ў адносінах стануць прадметам разгляду кіраўнікоў дзяржаў. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і Старшыня КНР Сі Цзіньпін правядуць перагаворы ў вузкім і пашыраным складах. Чакаецца, што па выніках перагавораў будзе падпісаны вялікі пакет дакументаў па развіцці адносін у ключавых сферах. Плануецца, што ў Пекіне Прэзідэнт таксама правядзе шэраг сустрэч з вышэйшымі службовымі асобамі КНР, кіраўніцтвам кітайскіх карпарацый.**

**А напярэдадні візіту Аляксандр Лукашэнка даў вялікае інтэрв'ю кітайскім СМІ. Журналістаў цікавілі не толькі пытанні беларуска-кітайскіх адносін, але і пазіцыя беларускага лідара па актуальным парадку дня ў рэгіёне і свеце ў цэлым. Фрагменты гэтай размовы прапануем вашай увазе.**

## АБ КАНФЛІКЦЕ ВА УКРАІНЕ

«Цяпер склалася ўнікальная сітуацыя (я гэта бачу і інтуітыўна адчуваю), калі можна пакласці канец гэтаму канфлікту. Іншай такой можа не быць, — сказаў кіраўнік дзяржавы, адказваючы на пытанне, якімі яму бачацца перспектывы расійска-ўкраінскага канфлікту. — Трэба карыстацца гэтым момантам, пакуль Расія не разгарнула сваю эканоміку ў поўным аб'ёме і не паставіла яе на ваенныя рэйкі. Унікальны момант».

Мэтай Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна, паводле слоў беларускага лідара, з'яўляецца перш за ўсё гарантаванне бяспекі для сваёй краіны — каб з тэрыторыі Украіны ніколі не было прыкмет агрэсіі ў адносінах да Расіі. «І Расія гатова сёння рабіць крокі да мірнага ўрэгулявання. Яна з першых дзён гэта рабіла», — нагадаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што рана ці позна ўсё роўна любая вайна заканчваецца мірам, і цяперашняя — не выключэнне. Пытанне толькі ў тым, колькі людзей загіне і ў імя чаго. Прэзідэнт звярнуў увагу, што калі ў свеце ўзнікне чарговы канфлікт, то пра Украіну ўсе забудуцца. Калі, крый божа, абвострацца адносіны ЗША і Кітая, дойдзе да адкрытага канфлікту гэтых дзвюх глабальных дзяржаў, то ўвага ўсёй планеты будзе звернута туды. «Украіна павінна і гэта разумець. Таму няма іншага шляху, як заключыць мірны дагавор цяпер. Без папярэдніх умоў», — перакананы Аляксандр Лукашэнка.

«Трэба сачыць за інтарэсамі ўласнага народа. Трэба рабіць усё, каб не дапусціць далейшай гібелі ўкраінцаў. Гэта цудоўны, добры народ. Трэба спыніць гэту вайну. Шлях адзін — мір», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

## АБ РОЛІ КІТАЯ Ў СВЕЦЕ

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што пазітыўна ацэньвае ініцыятыву Кітая і яго лідара аб неабходнасці глабальнага міру і лічыць яе вельмі прагматычнай. «Толькі ў мірных умовах, у мірным развіцці нашай планеты поспех у тым ліку і кітайскага народа. Будзе мір — ніхто Кітаю не перашкодзіць стаць глабальнай дзяржавай. А Кітай ужо стаў такой краінай, без якой не вырашаецца нічога ў свеце. Далейшае развіццё Кітая звязана толькі з мірам. Гэта такі прагматычны падыход», — сказаў ён.

Безумоўна, мір патрэбны і іншым народам, таму ініцыятыва КНР станоўча ацэньваецца многімі. «Ідэя вялікага Кітая і яго лідара аб глабальным міры — гэта вялікі ўклад у мірнае развіццё ўсёй планеты. Гэта выгадна і Еўропе, і Украіне, і Беларусі, і Амерыцы. Толькі мір. Вайна прывядзе да катастрофы», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

«Думаю, што ў найбліжэйшую пяцігодку Кітай стане вядучай дзяржавай свету. Кітай сёння ведаеце, хто хоча стрымаць, спыніць. Гэта немагчыма, — прадоўжыў Аляксандр Лукашэнка. — Кітай сёння ніхто стрымаць не зможа, і спыніць у тым ліку».

## АБ ПАВОДЗІНАХ ЗАХОДНІХ КРАІН

Як было адзначана падчас інтэрв'ю, краіны калектыўнага Захаду, прыкрываючыся ўяўнымі мэтамі аб абароне незалежнасці і суверэнітэту, умешваюцца ва ўнутраныя справы асобных дзяржаў, правакуючы канфлікты і дэстабілізацыю абстаноўкі.



Такі негатыўны ўплыў зведала на сабе ў тым ліку і Беларусь.

«Дурная бесперспектыўная палітыка, — так адказаў Аляксандр Лукашэнка на пытанне, як ён ацэньвае такія паводзіны краін Захаду. — Мы тут былі падвергнуты такой агрэсіі праз так званую «каляровую рэвалюцыю». Яна ў нас праявілася ў форме мяцяжу. Але і Кітай быў схільны да гэтага. Яны спрабавалі вас хістаць у Ганконгу, на поўдні Кітая. Яны ўлезлі нават у інтарэсы вялікага Кітая».

Часта для грубага ўмяшання ў справы іншых дзяржаў у якасці нагоды ЗША і краіны Захаду выкарыстоўваюць барацьбу за правы чалавека. У выпадку з Кітаем гаворка ідзе аб уйгурах. «Нагнятанне сітуацыі, што там няма правоў чалавека... Вось амерыканцы прыйдуць і ўсталююць «дэмакратыю» ўйгурам і дапамогуць з правамі чалавека... Лухта гэта ўсё. Толькі Кітай зможа на сваёй тэрыторыі ўсім народам даць права свабодна жыць і існаваць. Толькі Кітай сваёй сілай і палітыкай можа забяспечыць нармальнае існаванне гэтых народаў. Амерыканцы проста праз гэта жадаюць улезці (у дадзеным выпадку — у Кітай) і распаліць грамадзянскую вайну. Ім трэба аслабіць Кітай. Таму яны шукаюць розныя шляхі і кропкі, на якія змогуць націскаць і кіраваць асобнымі дзяржавамі. І не толькі дзяржавамі, а цэлымі рэгіёнамі», — даходліва растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

Аднак свет змяніўся, і сёння нават у ЗША не атрымаецца весці войны на ўсіх франтах, перакананы беларускі лідар. «Таму трэба дамаўляцца. Усюды трэба дамаўляцца. У Японіі, Карэі, Кітая, Расіі, Індыі, іншых краін ёсць свае інтарэсы. Нават у Афрыцы, якая развіваецца, — у іх свае інтарэсы. Буйныя краіны павінны іх улічваць, а не праводзіць палітыку неакаланіялізму, як гэта спрабуе рабіць Захад у Афрыцы (я нядаўна быў у Афрыцы і добра знаёмы з гэтымі працэсамі). Свет павінен развівацца толькі ў гэтым ключы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

## ПРА «ВЯЛІКІ КАМЕНЬ» І ЛАГІСТЫКУ

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў вялікую ролю Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень» як пляцоўкі для прасоўвання на рынкі многіх краін. «У яго сапраўды вялікая будучыня. Мы вельмі трапятліва ставімся да гэтага вялікага праекта, эканамічнага перш за ўсё, прамысловага», — падкрэсліў беларускі лідар. Ён звярнуў увагу, што ў парку створаны вельмі спрыяльныя ўмовы: «У прававых адносінах няма такіх умоў для супрацоўніцтва, для работы ў іншых краінах. Няма такога ўзроўню льгот, прэферэнцый, якія створаны тут, у Беларусі. Гэта вельмі выгадна для бізнесу. Мы гатовы ў гэтым плане ўдасканальвацца. Хоць я часам думаю: куды ўжо больш, фактычна беспадатковы рэжым. Бізнес з задавальненнем сюды прыходзіць».

Калісьці старшыня КНР Сі Цзіньпін назваў праект «Вялікі камень» жамчужынай шаўковага шляху. Тым больш гэта актуальна цяпер, калі Кітай праз Расію, выкарыстоўваючы чыгуначныя, аўтамабільныя шляхі, авіяперавозкі, без праблем можа дастаўляць тавары і камплектуючыя, сваю прадукцыю да «Вялікага каменя».

Адной з важных пераваг для Кітая ў рэгіёне з'яўляецца лагістыка для прасоўвання сваіх тавараў, і тут Беларусь можа адыграць для Кітая і адыгрывае галоўную ролю. «Беларусь знаходзіцца ў цэнтры Еўропы. Велізарная пляцоўка для таго, каб вялікаму Кітаю разгарнуцца тут. Калі ласка, — сказаў Прэзідэнт. — Я гэта прапанаваў Сі Цзіньпіну, і ён пагадзіўся. Папярэднія кіраўнікі да яго асцярожнічалі, не вельмі актыўна ў гэтым напрамку дзейнічалі. Адметнай рысай Сі Цзіньпіна стала тое, што ён убачыў Беларусь, разгледзеў і вырашыў: так, з Беларуссю трэба супрацоўнічаць, ствараць тут вытворчасці і працаваць па ўсім свеце, гэта зручная пляцоўка».

«Канфлікты калі-небудзь скончацца. Непаразуменне, супярэчнасці сыдуць, а інтарэсы народаў і дзяржаў застануцца. Ваш інтарэс у Беларусі — прыходзьце і працуйце па ўсіх напрамках. Забароненых, закрытых ад КНР тэм у нас няма. І гэта не на шкоду будзе суседзям», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што ад спалучэння ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях» з палітыкай ЕАЭС выйграюць усе бакі: «Мы можам тут шмат атрымаць не толькі ад лагістыкі і простага гандлю, але і ад высокіх тэхналогій, якія будуць рухацца ў двух напрамках. Гэта не за гарамі. Таму для нас гэта вельмі цікава, мы абмяркоўвалі нядаўна на савеце кіраўнікоў дзяржаў і СНД, і ЕАЭС шляхі паглыблення супрацоўніцтва з кітайцамі. І перш за ўсё на падставе канцэпцыі «Адзін пояс, адзін шлях».

## АБ ПЕРСПЕКТЫВАХ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Адказваючы на пытанне аб стане і перспектывах узаемаадносін дзвюх краін, кіраўнік дзяржавы нагадаў аб гісторыі іх станаўлення і згадаў свой першы візіт у Кітай, яшчэ ў бытнасць дэпутатам парламента, якраз пасля распаду Савецкага Саюза. «У Савецкім Саюзе тэхналагічны ўзровень, узровень інавацый, новых ідэй быў каласальны. Беларусь была тым цэнтрам, дзе былі сканцэнтраваны новыя тэхналогіі. І тады нашы ўсе перагаворы пачыналіся і заканчваліся не толькі гандлем, а перш за ўсё інвестыцыямі і новымі тэхналогіямі. Кітай цікавілі любыя новыя тэхналогіі. Мы дзяліліся з кітайскім народам, дзяржавай тымі тэхналогіямі, якія іх цікавілі. Забягаючы наперад, скажу, што сёння мы ўжо ў кітайцаў вучымся новым тэхналогіям, якія нас цікавяць. Ва ўсіх галінах: ад біятэхналагічнай сферы да абароны. Вы рушылі наперад значна, за гэты час вы сталі сусветнай дзяржавай. Без вас не можа быць вырашана ніводнае пытанне», — сказаў беларускі лідар.

Прэзідэнт разлічвае, што ў гэтым працэсе не будзе ніякіх перашкод з боку Кітая. «Мы тады нічога не шкадавалі для Кітая. Павінен дапамагчы нам і Кітай. Я намякаю перш за ўсё на новыя нашы напрамкі супрацоўніцтва — «Вялікі камень». Мы чакаем тут большай колькасці рэзідэнтаў з КНР, высокатэхналагічных рэзідэнтаў, прадпрыемстваў», — адзначыў ён.

Вялікую цікавасць для Беларусі, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, уяўляе далейшае развіццё БНБК. «Гэта сумеснае прадпрыемства. Мы два этапы прайшлі, нам патрэбны трэці — стварэнне на гэтай базе вытворчасці вітамінаў. Я думаю, што Сі Цзіньпін нам дапаможа ў гэтым плане. Чаму я кажу, што Сі Цзіньпін, таму што толькі дзякуючы яго рашэнню стала магчымай рэалізацыя гэтай праграмы. Чатыры-пяць дзяржаў у свеце маюць такія вытворчасці. І Кітай дапамог нам стварыць такую біятэхналагічную карпарацыю. Гэта найвышэйшыя тэхналогіі», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

«Рэдка з якой дзяржавай Кітай мае такі ўзровень супрацоўніцтва. Мы гэта вельмі цэнім, разумеючы, што такое гіганцкі Кітай і наша Беларусь. Мы гэта вельмі цэнім», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

**Паводле БелТА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ЕС і Вялікабрытанія дасягнулі пагаднення ў рамках здзелкі па Brexit

Лондан і Брусель дасягнулі пагаднення ў рамках здзелкі па выхадзе Вялікабрытаніі з ЕС. Гэта датычыцца змянення пратакола па Паўночнай Ірландыі, што дапаможа пазбегнуць узнікнення бар'ераў унутры Злучанага Каралеўства, паведаміла ТАСС. Аб дасягненні дамоўленасці заявіў кіраўнік брытанскага ўрада Рышы Сунак. Паводле яго слоў, пагадненне паміж Лонданам і Бруселем дазволіць наладзіць бесперашкодны рух тавараў унутры Вялікабрытаніі. Цяпер брытанскія тавары будуць завозіцца ў Паўночную Ірландыю па зялёным калідоры, а прадукцыя, прызначаная для краін Еўрасаюза, — па чырвоным. Сунак таксама заявіў, што пагадненне, якое атрымала назву «Віндзарская канцэпцыя», дае права парламенту Паўночнай Ірландыі выказаць нязгоду з заканадаўчымі нормамі ЕС. У гэтым выпадку Лондан можа налажыць на дадзеныя нормы вета. У выніку жыхары Паўночнай Ірландыі змогуць самі вызначаць заканадаўства, якое прымяняецца ў рэгіёне.

### Міністр фінансаў Германіі распавёў аб дзесяціразовым росце дзярждоўгу ФРГ

Выплаты працэнтаў па дзярждоўгу ФРГ выраслі з 2021 года ў 10 разоў, павялічыўшыся з 4 млрд да 40 млрд еўра. Пра гэта расказаў міністр фінансаў Германіі, лідар Свабоднай дэмакратычнай партыі Германіі (СвДП) Крысціян Ліндނер, паведаміла Die Zeit. «Гэта грошы, якіх будзе не хапаць на іншыя мэты», — заўважыў палітык. Ліндэр выступіў супраць абмеркавання прыпынення дзеяння даўгавога тормаза. Кіраўнік Мінфіна ФРГ папярэдзіў, што ва ўмовах высокай інфляцыі і росту працэнтных ставак любая пазыка прывядзе да значных працэнтных расходаў. Пазыковы тормаз замацаваны ў Канстытуцыі Германіі, ён забараняе ўраду зводзіць бюджэт з дэфіцытам. У апошні час дзеянне нормы некалькі разоў прыпынялі з-за пандэміі каранавіруса, аднак у найбліжэйшым федэральным бюджэце яна павінна быць адноўлена. На мінулым тыдні Крысціян Ліндэр у інтэрв'ю выданню T-Online заявіў, што рост доўгу быў выкліканы прыняццем надзвычайных мер з-за COVID-19, а таксама энергетычным крызісам. У сувязі з гэтым лідар СвДП адзначыў, што кабміну трэба абмяжоўваць выдаткі, і таму дзяржава не зможа вырашыць бягучыя эканамічныя праблемы, у тым ліку спад дабрабыту.

### У ЗША колькасць парушэнняў умоў дзіцячай працы за апошнія пяць гадоў узрасла на 70 працэнтаў



Летась 835 кампаній парушылі законы аб дзіцячай працы. «Гэта не праблема XIX стагоддзя, гэта не праблема XX стагоддзя, гэта адбываецца сёння. Мы бачым, як дзеці па ўсёй краіне працуюць ва ўмовах, на якіх іх ніколі не павінны былі браць на работу», — прыводзіць Reuters словы прадстаўніка адміністрацыі прэзідэнта ЗША. Як адзначае агенцтва, большасць працуючых дзяцей з'яўляюцца выхадцамі з Цэнтральнай Амерыкі. Цяпер максімальны грашовы штраф за парушэнне законаў аб дзіцячай працы складае каля 15 тысяч долараў, што «недастаткова, каб служыць стрымальным фактарам». Паводле даных газеты Financial Times, летась колькасць непаўналетніх, якіх незаконна нанялі на работу, павялічылася больш як на тысячу і склала 3,8 тысячы дзяцей.

Медыяпрастора

# Эфектыўнасць, рэгіёны і кадры

## Аб чым гаварылі на выніковай калегіі Мініфарма

**Вынікі работы сродкаў масавай інфармацыі ў 2022 годзе і асноўныя задачы на бягучы год абмеркавалі на калегіі Міністэрства інфармацыі. Удзел узялі прадстаўнікі ўрада і Адміністрацыі Прэзідэнта, кіраўнікі вядучых рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ, ідэалагічны актыў краіны.**

### Ісці ў сацыяльныя сеткі і месенджары

**Міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ** назваў 2022 год няпростым, але насычаным і выніковым для айчынных медыя. Прыярытэтам для іх было выкананне дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі і забеспячэнне інфармацыйнага суверэнітэту краіны.

— Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі амаль сцерлі дзяржаўныя межы, а асноўнае інфармацыйнае проціборства перамясцілася ў лічбавае асяроддзе. Таму дзейнасць Міністэрства інфармацыі была накіравана на пашырэнне дзяржаўнай пазіцыі ў СМІ, у тым ліку ў інтэрнэце, і на кансалідацыю грамадства, — падкрэсліў Уладзімір Пярцоў.

Сярод задач, над якімі працавала міністэрства, ён адзначыў павышэнне якасці інфармацыйнага прадукту і прафесійнага ўзроўню работнікаў СМІ, прасоўванне дзяржаўнай пазіцыі ў інтэрнэт-прасторы, уключаючы актыўнае асваенне сацыяльных сетак і месенджараў, узбуйненне рэгіянальных СМІ і стварэнне медыяхолдынгаў, удасканаленне заканадаўства ў гэтай галіне, кантроль за станам інфармацыйнага поля.

Медыйнае поле Беларусі дастаткова насычанае і разнастайнае. Па стане на 1 студзеня бягучага года ў краіне зарэгістравана 1201 СМІ, у тым ліку летась з'явілася чатыры новыя сеткавыя выданні і адно друкаванае. Паводле даных сацыялагічных даследаванняў Інстытута сацыялогіі НАН, практычна штодзень інтэрнэтам карыстаецца 88,4 % беларусаў.

— У гэтай сувязі мы працягнулі актыўную работу па прасоўванні і ўмацаванні дзяржаўнай палітыкі ў інтэрнэце, уключаючы асваенне сацыяльных сетак і месенджараў. Эфектыўнасць гэтай работы пацвярджае рост інтэрнэт-аўдыторыі рэдакцый, — адзначыў Уладзімір Пярцоў.

### Рэагаваць на праблемы людзей

Гаворачы пра паляпшэнне якасці інфармацыйнага прадукту, міністр звярнуў увагу, што ў дзяржаўных СМІ рэалізаваны шэраг новых інфармацыйных прадуктаў, у тым ліку забаўляльных, пашыраны пералік інфармацыйна-аналітычных перадач, дадалося крытычных і праблемных матэрыялаў, хоць і не ўсюды.

У прыватнасці, рэгіянальная прэса мусіць больш актыўна рэагаваць на праблемы людзей.

— Пытанне не толькі ў крытычных матэрыялах, а ў рэагаванні рэгіянальнай, мясцовай прэсы на праблемы простых людзей. Я пра іх шмат разоў гаварыў на семінарах, трэнінгах, падчас індывідуальных наведванняў рэдакцый. Гэта ўвогуле ўсё, што хвалюе людзей. Калі пра гэта не будзе пісаць мясцовая прэса, калі яна не будзе рэагаваць на званкі, лісты, публікацыі ў мясцовых пабліках, сацыяльных сетках і месенджарах — значыць, яна будзе незапатрабаваная. Калі яна ўсё гэта асвятляе, калі яна паказвае праблемы і іх рашэнне, тады да яе будуць звяртацца, — заявіў міністр.

Пры гэтым ён падкрэсліў, што рэгіянальная прэса праходзіць цяпер маштабную перабудову, утвараюцца холдынгі. І рэдакцыі раённых газет, якія па розных прычынах не маглі наладзіць работу па належным дызайне, вёрстцы, па дзейнасці ў сацыяльных сетках, інтэрнэт-асяроддзі ў цэлым, далучаюцца да ўзбуйненай рэдакцыі, галаўнога холдынга, які бярэ на сябе тыя задачы. І прагрэс ёсць.

— Растуць падпісныя тыражы. Сацыялогія паказвае, што практычна 5-працэнтнае павелічэнне запатрабаванасці і даверу да рэгіянальнай прэсы. Гэта таксама вельмі добрыя лічбы. Так, рэгіянальных рэдакцый дастаткова шмат — практычна 135 гарадскіх і раённых газет. Там не ўсё так хутка можна зрабіць, але мы ўжо бачым станоўчыя моманты. Зроблена гэта ў першую чаргу для таго, каб рэгіянальная прэса была запатрабавана сваімі чытачамі, гледачамі, слухачамі ў рэгіёнах. Таму што ніхто акрамя іх — ні абласная, ні цэнтральная прэса — аб іх праблемах і клопатах расказваць не будзе. Заўсёды будуць патрэбны мясцовыя газеты, мясцовае радыё і мясцовае тэлебачанне, — дадаў Уладзімір Пярцоў.

### 25 мільёнаў долараў — на дэзынфармацыю

Сярод выклікаў мінулага года міністр назваў вялізную колькасць фэйкаў, не толькі звязаных са спецыяльнай ваеннай аперацыяй, але і на іншую тэматыку, небывалы санкцыйны ціск, адкліканне рэкламных бюджэтаў. У прыватнасці, для разумення маштабаў работы тых, хто распаўсюджвае фэйкі, міністр, спасылаючыся на Лігу вольнага інтэрнэту, прывёў лічбу ў 25 мільёнаў долараў, якія штодзень ідуць на распаўсюджанне дэзынфармацыі ў адносінах Расіі і Беларусі.

— Укладанні ўнушальныя, але нам удаецца гэтаму супрацьстаяць, — падкрэсліў міністр. — Увогуле, нашы апаненты зрабілі ўсё магчымае і немагчымае для таго, каб нас абваліць. Але, з іншага боку, вы ведаеце: усё, што нас не забівае, робіць мацнейшымі і любое дзеянне выклікае процідзеянне. Тым больш што мы, журналісты, народ спецыфічны: чым больш нас спрабуюць задушыць, тым больш у нас сіл і энергіі.

### Кадры вырашаюць усё

**Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар ЛУЦКІ** засяродзіў увагу прысутных на задачах, што стаяць перад профільным міністэрствам і медыя на бягучы год.

— Я хацеў бы пагаварыць аб тым, якіх памылак мы не павінны зрабіць у 2023 годзе. І ў гэтым кантэксце я вылучыў бы тры напрамкі: эфектыўнасць, рэгіёны і кадры, — сказаў Ігар Луцкі.

Ён нагадаў, што Прэзідэнтам было прынята рашэнне аб падтрымцы СМІ. Дастаткова вялікія рэсурсы накіраваны на дзяржаўныя СМІ. Але разам з тым важна, каб яны былі скарыстаны эфектыўна.

Не менш важнае пытанне — кадры.

— Прэзідэнтам прынята рашэнне аб стварэнні назіральнага савета на факультэце журналістыкі. Туды ж быў назначаны новы кіраўнік, дэкан факультэта. Аднак кіраўнікі СМІ таксама адказваюць сёння за падрыхтоўку спецыялістаў на факультэце журналістыкі БДУ. Пазіцыя такая: мы рыхтуем не проста журналістаў — мы рыхтуем байцоў інфармацыйнага фронту. Усе гэта павінны дакладна разумець і ўсведамляць. І падрыхтаваць гэтых байцоў — наша сумесная задача, а не толькі Міністэрства адукацыі і факультэта журналістыкі, — падкрэсліў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

На пытанне падрыхтоўкі кадраў звярнуў увагу і **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА.**

— Мы задумаліся над тым, што студэнты, якія прыйшлі ў ВНУ, павінны быць падрыхтаваны ўжо ў школе, ВНУ ім робіць дадатковую агранку, а практыка і рэальнае жыццё іх вучыць, як развіваць, захоўваць дзяржаву і ствараць самае камфортнае жыццё для нашых людзей. Таму задачы ўсіх узроўняў, не толькі СМІ, — рыхтаваць і выхоўваць кадры. Гэта і сістэма адукацыі. Павінны над гэтым працаваць усе, — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

Падводзячы вынікі работы галіны, Ігар Петрышэнка адзначыў, што ў 2022 годзе зроблена сапраўды шмат. Пастаўленыя перад Міністэрствам інфармацыі задачы ў цэлым вырашаны. Выбудавана сістэмная работа ў медыясферы, наладжана дзейснае ўзаемадзеянне са СМІ ўсіх узроўняў.

**Алена КРАВЕЦ.**

# НАШ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫ НАБЫТАК

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дванаццаты сезон папулярнага маладзёжнага праекта стартаваў 15 лістапада мінулага года. Для ўдзелу ў ім было пададзена 1200 заявак. Да рэспубліканскага фіналу прайшлі 66 занальных адборачных тураў, шэсць абласных, Мінскі гарадскі, адборачны тур Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і ўпершыню — міжуніверсітэцкі тур, арганізаваны Міністэрствам адукацыі.



Фота Лізаветы ГОЛАД.

Важнай адметнасцю апошняга сезона стала правядзенне комплексу практыка-арыентаванага навучання асновам стварэння, прэзентацыі, прасоўвання і рэалізацыі маладзёжных распрацовак. Па ўсёй краіне адбылося 75 навучальных мерапрыемстваў.

— Маладзёжны праект «100 ідэй для Беларусі» рэалізоўваецца ў нас у краіне ўжо больш за 10 гадоў і набыў статус нацыянальнага. Я заўсёды з цікавасцю прымаю ўдзел у фінальнай частцы гэтага спаборніцтва і бачу, як з кожным годам ён прырастае новымі імёнамі, новымі навукова-тэхнічнымі, інтэлектуальнымі распрацоўкамі, — падкрэсліў у сваім выступленні падчас урачыстага адкрыцця гранд-фіналу **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА.** — За ўсе гады правядзення конкурсу на яго было пададзена 17,3 тысячы заявак. І 3,5 тысячы распрацовак укараняецца сёння ў практычнае жыццё. Кожны этап праекта дазваляе нам убачыць новых таленавітых маладых людзей: школьнікаў, навучэнцаў каледжаў, студэнтаў, маладых даследчыкаў, аспірантаў. Усіх канкурсантаў аб'ядноўвае розум, талент, дапытлівасць, жаданне паказаць сябе і дабіцца чагосьці ў жыцці — паступіць у ВНУ, укараніць сваю распрацоўку, стаць вынаходнікам і рацыяналізатарам.

Ігар Сергеенка падкрэсліў, што галоўны індыкатар праекта — яго вынікі: «Сёння нам былі прадэманстраваны праекты, якія перамаглі летась. Напрыклад, малодая вучоная-даследчык з Акадэміі навук Вікторыя Шумская стала пераможцай конкурсу з распрацоўкай новай сістэмы ачысткі азотных угнаенняў ад вуглякіслага газу. Сёння гэты праект рэалізоўваецца і ўкараняецца на Гродзенскім вытворчым аб'яднанні «Азот», якое выпускае ўгнаенні. Яшчэ адзін праект належыць студэнту Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Андрэю Капітонаву. Яго распрацоўка — нейрасетка па класіфікацыі рэнтгенаўскіх здымкаў груднай клеткі, якая дазваляе выяўляць бессімптомную пнеўманію, ужо ўкаранёная ў сістэме аховы здароўя. І такіх яркіх прыкладаў, якія сёння рэалізоўваюцца на практыцы, шмат».

«Дзяржава ўдзяляе вельмі вялікую ўвагу развіццю маладзёжнай палітыкі ў нашай краіне, каб моладзь актыўна ўдзельнічала ў грамадска-палітычных мерапрыемствах, у сацыяльна-эканамічным развіцці, дэманстравала свае інтэлектуальныя магчымасці, — падзяліўся меркаваннем пасля азнаямлення з экспазіцыяй **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА.** — Галоўнае, каб гэта ўсё служыла на карысць Беларусі. Прыняты шэраг праграмных дакументаў, якія падтрымліваюць моладзь. Таксама дзейнічае падпраграма па маладзёжнай палітыцы. Функцыянуюць фонды па падтрымцы таленавітай моладзі, выдзяляюцца адпаведныя гранты для развіцця і ўкаранення распрацовак. У цэлым для маладых людзей створаны ўсе ўмовы для таго, каб яны маглі атрымаць якасную адукацыю і прафесійна рэалізавацца менавіта ў нашай краіне. У нашай моладзі светлыя, цікавыя, перспектыўныя ідэі...»

Віцэ-прэм'ер адзначыў вельмі цікавыя і нестандартныя рашэнні, убачаныя ў фінале «100 ідэй». «Дарэчы, многія хлопцы і дзяўчаты ўжо па некалькі разоў прайшлі навучанне ў Нацыянальным дзіцячым тэхнапарку. Гэты праект функцыяніруе па рашэнні кіраўніка дзяржавы з 2021 года. І толькі летась каля 840 нашых школьнікаў дзявятых—адзінаццатых класаў паспяхова прайшлі ў ім навучанне і сёння дэманструюць тут многія цікавыя рэчы. Мы бяром на заметку гэтыя праекты, яны будуць падтрымлівацца і рэалізоўвацца, а мы будзем і надалей падтрымліваць маладых у іх памкненнях», — паабяцаў Ігар Петрышэнка.

«Вельмі прыемна, што ў гэтым годзе прадстаўлена шмат інавацыйных праектаў у адукацыйнай сферы, — падзяліўся меркаваннем **міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ.** — Напрыклад, мы бачылі новыя інавацыйныя тэхналогіі для работы з дзецьмі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія ўжо выкарыстоўваюцца ў нашых установах адукацыі. Яны дапамагаюць інтэгравацца такім дзеткам у звычайны адукацыйны працэс. Гэта вельмі важна для іх сацыялізацыі, каб кожны з іх атрымаў пуцёўку ў жыццё».

Ён падкрэсліў, што конкурс «100 ідэй для Беларусі» мае вялікую гісторыю. Ён быў запушчаны ў 2011 годзе і выйшаў ужо на міжнародны ўзровень. З перыядычнасцю раз на два гады праходзіць конкурс «100 ідэй для СНД». У гэтым годзе ў Мінску будзе праходзіць чарговы фінал, дзе ўсе таленавітыя хлопцы і дзяўчаты з розных краін СНД змогуць прадставіць свае праекты».

Па словах міністра адукацыі, пераможцы конкурсу «100 ідэй для Беларусі» атрымаюць пуцёўкі на рэспубліканскі конкурс інавацыйных праектаў і прымуць удзел у намінацыі «Найлепшы маладзёжны інавацыйны праект». «Гэта вельмі важна, таму што там прадугледжваецца значнае фінансаванне для распрацоўкі бізнес-плана. Фактычна гэта афармленне ідэі ў канкрэтны, гатовы бізнес-праект, які павінен быць у далейшым укаранёны ў рэальны сектар эканомікі, — расказаў міністр. — Таксама немалаважны аспект, што ўсе пераможцы змогуць прэтэндаваць на ўключэнне ў спецыяльны фонд Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі. Гэта фактычна нaваўвядзенне гэтага года. Яно стане вельмі добрым матыватарам для нашай моладзі яшчэ больш актыўна ўдзельнічаць у конкурсе».

**Першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ** звярнуў увагу на тое, што ў 12-м сезоне «100 ідэй для Беларусі» прадстаўлена вялікая колькасць сацыяльна значных праектаў, аўтарамі якіх з'яўляюцца школьнікі. Лідар Саюза моладзі заўважыў, што ён перажывае дакладна такія ж эмоцыі, як і дзесяць гадоў таму, калі сам прымаў удзел у фінале «100 ідэй». Перамога ў гэтым конкурсе стала для яго добрай стартавай пляцоўкай у жыцці. Звяртаючыся да канкурсантаў, ён адзначыў: «Вы ўсе знаходзіцеся яшчэ толькі ў пачатку вельмі важнага шляху. Сёння вы дэманструеце і свой асабісты патэнцыял, і патэнцыял сваёй краіны. Я лічу, што тут сабраны не проста «100 ідэй для Беларусі», а сканцэнтраваны інтэлектуальны патэнцыял нашай дзяржавы...»

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Кніжны свет

# Каб мастацкі твор станавіўся падзеяй

## Як сучаснаму пісьменніку дастукацца да чытача, раіліся ў Брэсце

**Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага стала пляцоўкай для правядзення круглага стала «Сучасная беларуская кніга: шляхі развіцця, задачы распаўсюджвання». У лагічнай звязцы паміж аўтарам, выдаўцом, распаўсюджвальнікам, папулярызатарам літаратуры і чытачом бібліятэкам вельмі часта належыць ключавая роля. Пра гэта яшчэ раз нагадала, адкрываючы мерапрыемства, намеснік дырэктара Брэсцкай абласной бібліятэкі Ларыса ВЕРАМЧУК. Як зрабіць кнігу больш уплывовай, запатрабаванай, а мастацкае слова — неабходным сучаснаму чалавеку, раіліся зацікаўленыя спецыялісты.**



— Сацыяльныя з'явы апошняга часу, на жаль, не найлепшым чынам адбіваюцца нават на гісторыі нашых народаў, нашых краін, тым больш — на асветніцтве. І ў гэтых умовах бібліятэчная структура — першы памагаты стваральнікаў мастацкага слова ў справе яго захавання і прасоўвання літаратуры да чытача, — сказаў у сваім выступленні **дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда», старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.** — Дзякуючы вашай рабоце праца літаратараў, у тым ліку аўтараў Берасцейшчыны, прадоўжыцца, застанецца для будучых пакаленняў, як для нас застаецца творчая спадчына папярэднікаў.

Гаворка зайшла аб тым, што 2022 год быў не найгоршым у справе кнігавыдавецтва. У краіне ёсць шэраг праграм па забеспячэнні бібліятэк літаратурай, і яны выконваюцца.

Але ж спецыялісты вымушаныя канстатаваць тэндэнцыі грамадства, якія служаць не на карысць развіцця мастацкай літаратуры. І звязаныя яны, на думку старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі, з новым светаўспрыманнем чалавека. Сучаснік, па-першае, не разглядае літаратуру як медыя. Калі згадаць 1960-я, 1970-я, нават 1980-я гады, літаратура стаяла ў шэрагу медыя. Прыклад таму — калі творы па гісторыі савецкага перыяду імгненна перадрукоўвалі таўстыя літаратурныя часопісы ў выданні з мільённымі тыражамі. Варта прызнаць таксама, што за апошнее дзесяцігоддзе літаратура ў значнай ступені выпала з адукацыйнага працэсу. Скажам, цяпер перасталі выдаваць хрэстаматыі для школьнікаў. Наіўна меркаваць, што вучань будзе дабрасумленна насіць творы з бібліятэкі... Але ж гэта новыя рэаліі. І ў такіх умовах у творцаў мастацкага слова толькі адно выйсце: твор павінен станавіцца падзеяй, з'явай, тады ён будзе заўважаны.

Калі ж гаварыць пра тэхналагічныя рашэнні агульнай задачы, то яны звязаныя з работай як бібліятэк (дарэчы, абласную бібліятэку назвалі ўзорам у вядзенні ўласнага інфармацыйнага рэсурсу), так і, напрыклад, абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў.

Старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення СП Беларусі Таццяна ДЗЕМІДОВІЧ расказала пра сучасны літаратурны працэс на Брэстчыне, падзялілася прыемнай навіной: у першай палове дня прайшла цырымонія ўзнагароджання пераможцаў конкурсу «Духоўная веліч». Конкурс заснаваны ў 2018 годзе абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў і галоўным упраўленнем ідэалагічнай работы і па справах моладзі аблвыканкама пры падтрымцы Брэсцкай і Пінскай епархій БПЦ, а таксама Беларускага фонду міру. У абласнога аддзялення няма ўласных праектаў. Адзін з іх — альманах «Берасцейская скарбніца», ён выходзіць на сродкі саміх аўтараў, уключае ў сябе творы, прысвечаныя важным падзеям у краіне і рэгіёне. Усяго іх выйшла чатыры, былі выпускі, прысвечаныя 1000-годдзю Брэста, Году гістарычнай памяці. У альманах увакходзяць паэтычныя і празаічныя творы, друкуюцца літаратары з блізкага замежжа. Літаратурна-краязнаўчы альманах «Астрамечаўскі рукапіс» у бягучым сезоне будзе адзначаць дзесяцігоддзе. Гэта ўнікальнае выданне прадстаўляе цікавыя матэрыялы па краязнаўстве, публікуе як сталых, так і маладых аўтараў. Рэгулярна выходзяць калектыўныя зборнікі брэсцкіх аўтараў, кнігі асобных пісьменнікаў.

Упрыгожылі круглы стол прэзентацыямі свайго вопыту работы бібліятэкары-практыкі. Так, дырэктар Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы г. Баранавічы Таццяна РУДКОЎСКАЯ расказала і паказала на прыкладзе відэаматэрыялаў знаходкі баранавіцкіх бібліятэкараў у справе папулярызацыі беларускай кнігі. Гэта традыцыйныя, а таксама інавацыйныя формы работы: гучныя чытанні, сустрэчы з беларускімі літаратарамі, конкурсы, інтэлектуальныя спаборніцтвы. А лялечныя спектаклі па творах айчынных аўтараў ладзяць бібліятэкары разам з чытачамі: самі ствараюць дэкарацыі, становяцца на нейкі час сапраўднымі артыстамі.

Ганцавіцкія бібліятэкары самі выступаюць у якасці рэжысёраў, сцэнарыстаў і аператараў відэафільмаў пра свой край. Адночы яны выйшлі пераможцамі рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры», купілі апаратуру, цяпер здымаюць сюжэты і размяшчаюць іх на сайце бібліятэкі, аб чым паведаміла дырэктар Ганцавіцкай раённай цэнтралізаванай сістэмы Ала ХВАЛЬ. Загадчыца аддзела краязнаўства абласной бібліятэкі Ірына ЖЭЛЯГОЎСКАЯ падзялілася напрацоўкамі сваёй установы па папулярызацыі краязнаўчага рэсурсу. Несумненна, абмен думкамі паміж бібліятэкарамі і пісьменнікамі атрымаўся карысным і плённым.

У рамках круглага стала адбылася прэзентацыя выдавецкіх праектаў Выдавецкага дома «Звязда». Шэраг бібліятэкараў атрымалі ўзнагароды ад Выдавецкага дома за плённае супрацоўніцтва. Да мерапрыемства таксама была прымеркавана выстава «Радзіма ў слове: пісьменнікі Берасцейшчыны — юбіляры-2023». Аказалася, што бягучы год багаты на такія юбілеі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Брэсцкай абласной бібліятэкі.**

Запрашальнік

# У ВАНДРОЎКУ... З ДЗЕДАМ ТАЛАШОМ

**2 сакавіка на пляцоўцы Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа адбудзецца Фестываль дзіцячай кнігі «Ідзі, зіма, ідзі ў дарогу!». Арганізатары — Коласаўскі музей, Саюз пісьменнікаў Беларусі, Выдавецкі дом «Звязда», Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк горада Мінска, кнігарня «Акадэмкніга».**

У праграме фестывалю — аўтограф-сесіі дзіцячых літаратараў краіны, прэзентацыі іх кніг, цэлы шэраг іншых захапляльных мерапрыемстваў. Будуць працаваць інтэрактыўныя пляцоўкі. З настольнымі забаўлянкамі пазнаёміць Наталля Галко. Па тэрыторыі сядзібы будзе праведзена вандроўка на тэму «У пушчах Палесся» з удзелам сапраўднага (!) літаратурнага, коласаўскага персанажа — дзеда Талаша, партызана з кнігі «Дрыгва».

Сярод удзельнікаў фестывалю «Ідзі, зіма, ідзі ў дарогу!» — пісьменнікі Алена Стэльмах, Галіна Пшонік, Аляксей Шаўцоў, Павел Гушчынец, Жанна Міус, Кацярына Хадасевіч-Лісавая, Алесь Карлюкевіч. Яны раскажуць школьнікам пра свае новыя кнігі, якія толькі што пабачылі свет, пра герояў сваіх мастацкіх твораў. Будзе прэзентаваны і зборнік беларускіх народных казак у апрацоўцы народнага песняра Беларусі Якуба Коласа.

**Сяргей ШЫЧКО.**

Дзеля памяці

# Дарога на неба праз Белыя Росы

## Памёр драматург Аляксей Дудараў



**«Мяне заўсёды цікавіў чалавек»...**
**Аўтар гэтых слоў, што як найлепш характарызуюць яго творчасць, вядомы беларускі драматург Аляксей Дудараў памёр 27 лютага, на 73-м годзе жыцця.**

Звестка аб яго раптоўнай смерці стала нечаканай і ўзрушальнай — Аляксей Дудараў успрымаўся нейкай пастаяннай велічынёй, якая тут і цяпер пацвярджае значнасць нацыянальнай культуры, яе ўбудаванасць у сусветную... Кожны яго твор заўсёды рабіўся падзеяй.

Цяпер застаецца асвойваць, пераглядаць, перачытваць спадчыну, якая яшчэ пры жыцці творцы была прызнанай класікай.

У 1979 годзе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» ў серыі «Першая кніжка празаіка» выйшаў зборнік апавяданняў пад назвай «Святая птушка». Яго пачынала апавяданне з гэтай жа назвай, пра вясковага дзівака, які ладзіць на дрэве каля сваёй хаты буслянку, нягледзячы на кпіны і неразуменне аднавяскоўцаў і ўласнай жонкі. Таму што ёсць у яго мара — каб кружылі над вёскай буслы, святыя для беларусаў птушкі. Таму што жыве паэзія ў душы народа, якую чуюць і ўвасабляюць яго песняры... Аляксей Дудараў чуў душу беларускага народа. Недарэмна яго «Белыя Росы» сталі культавым фільмам, спрэс расцягнутым на цытаты. Недарэмна смяяліся і плакалі гледачы, калі паўставаў на сцэне настальгічны, вясёлы і шчымлівы «Вечар», ды ўзрушваліся горкай памяццю вайны на «Радавых»...

Пра што б ні пісаў Аляксей Дудараў, ён пісаў з любоўю да Беларусі, да свайго народа, і тыя пачуцці перадаваліся чытачу і гледачу. Апошнія гады Аляксей Ануфрыевіч быў мастацкім кіраўніком Драматычнага тэатра Беларускай арміі, вялікую ўвагу надаваў моладзі, казаў, што хоча, каб тыя, хто працуе ў яго тэатры, адчувалі сябе шчаслівымі. Шмат гадоў з'яўляўся старшынёй Беларускага саюза тэатральных дзеячаў. «Пра планы на будучыню я не люблю разважаць. Проста трэба жыць і працаваць. Тое, што павінна быць напісана, будзе напісана, а тое, што не атрымаецца, тое не атрымаецца», — ён так казаў.

Няма сумнення, што гэтымі днямі прыхільнікі творчасці Аляксея Дударава перагледзяць і «Белыя Росы», і іншыя экранізаваныя яго творы... Перачытаюць яго кнігі. І мы яшчэ не раз убачымся з яго персанажамі, дзівакаватымі і задумлівымі, гераічнымі і высакароднымі — на сцэне і на экранах. Аднойчы на пытанне, чаго б ён пажадаў сучаснаму чалавеку, Аляксей Ануфрыевіч адказаў: «Веры. Яна дае надзею. А калі верыш і спадзяешся, здабудзеш любоў. А калі побач любоў, няма беднасці, няма хваробы. І смерці няма».

Яго любоў, вера і надзея захаваюць тое, што ён стварыў, для вечнасці.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

**Саюз пісьменнікаў Беларусі глыбока смуткуе з прычыны смерці Аляксея Ануфрыевіча ДУДАРАВА, старшыні Беларускага саюза тэатральных дзеячаў, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР, лаўрэата прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва, і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**


БЕЛАРУСБАНК

**ПУБЛИЧНАЯ ОФЕРТА (предложение)**
**на изменение порядка уменьшения ставки дохода по вкладу в связи с изменением ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь до 11 % годовых**

1. ОАО «АСБ Беларусбанк» устанавливает, что снижение ставки дохода, указанной в договоре банковского вклада (депозита), в связи со снижением с 01.03.2023 ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь до 11 % годовых (Постановление Правления Национального банка Республики Беларусь от 23.02.2023 № 60) осуществляется с 02.04.2023 по следующим банковским вкладам (депозитам) в белорусских рублях:
- срочный банковский вклад «Жилищно-накопительный» (проценты по вкладам, открытым по 28.10.2018 (включительно));
- банковский целевой вклад «Попечение» (проценты по вкладам, открытым по 31.01.2016 (включительно)).

Установленный порядок применяется к вышеуказанным банковским вкладам (депозитам) в случае, если по ним по состоянию на 02.04.2023 не начисляется пониженная процентная ставка или доход по вкладу не начисляется в размере ставки вклада до востребования.

2. Акцептом публичной оферты (предложения), указанной в пункте 1, является получение вкладчиком в полном объеме процентов по вкладу за период с 01.03.2023 до даты изменения процентов по вкладу – 02.04.2023.

**Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте belarusbank.by и в отделениях Беларусбанка**

Сохранность и возврат вкладов гарантируются в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Процентная ставка по вкладам (депозитам) может быть изменена банком в одностороннем порядке в соответствии с договорами банковских вкладов (депозитов).
*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 11.01.2019, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912*



**ООО «СпецРеализация»**
**объявляет о проведении четвертых повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества**
**ООО «Миран-парфюм г. Докшицы»**
(УНП 300362862, Минская область, Минский район, с/с Щомыслицкий, д. 16, оф. 12),
**находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)**

***Дата и время проведения торгов*: 16 марта 2023 года.** Начало – 10.00.

Заявки принимаются с 01 марта 2023 года по 14 марта 2023 года.

***Место проведения торгов:*** г. Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ООО «Миран-парфюм г. Докшицы» (УНП 300362862)** в лице антикризисного управляющего – директора частного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт» Комса Инги Анатольевны, тел. 8 (029) 133-01-01.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 2 %.

Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайтах http://bankrot.gov.by и http://www.specrealization.by.

Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.

Сведения о предыдущих торгах:

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 186 (29808) за 22.09.2022.

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 231 (29853) за 24.11.2022.

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 253 (29875) за 24.12.2022.

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 20 (29900) за 01.02.2023

# САМІ БУДЗЕМ СЫТЫЯ І СУСЕДЗЯЎ НАКОРМІМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Доля экспарту сельгаспрадукцыі ў агульным экспарце краіны перавышае 20 %. Айчынныя аграрыі пастаўляюць свае тавары ў больш чым 100 краін свету. Пры гэтым асноўным стратэгічным партнёрам і прэміяльным рынкам застаецца Расія. Менавіта туды ў мінулым было накіравана каля 70 % усёй экспартаванай прадукцыі. Зараз асаблівы ўпор робіцца на супрацоўніцтва з расійскімі рэгіёнамі. Работнікі аграпрамысловага комплексу маюць намер пастаўляць сваю прадукцыю практычна ў кожную вобласць суседняй краіны.

Па словах Вадзіма Шагойкі, на гэты момант практычна ўсе айчынныя прадпрыемствы, якія хочуць працаваць з расійскімі партнёрамі, могуць гэта рабіць без абмежаванняў.

«Асобныя прадпрыемствы могуць закрывацца па нейкіх відах прадукцыі ветэрынарнай службай — гэта пытанне тэхнічнага характару. Але нейкай негатыўнай тэндэнцыі або сістэмы на сёння няма», — адзначыў намеснік міністра.

Традыцыйна нядрэнна ў айчынных кампаній складваюцца адносіны з краінамі СНД і ЕАЭС. Беларусь экспартуе сельгаспрадукцыю ў Арменію, Азербайджан, Таджыкістан, Туркменістан і Узбекістан.

Дастаткова актыўная работа летась вялася па пашырэнні геаграфіі паставак. Вялікая ўвага — азіяцкім краінам, у прыватнасці Кітаю. Гэтую краіну ў Мінсельгасхарчы называюць адным з самых ёмістых і перспектыўных рынкаў. Па даных за студзень-верасень 2022 года, сельскагаспадарчыя прадпрыемствы нарасцілі туды пастаўкі харчавання на 60 %, экспарт наблізіўся да лічбы ў 500 мільёнаў долараў. Акрамя таго, айчынная сельгаспрадукцыя запатрабавана на рынках такіх краін, як ААЭ, Пакістан, Індыя. Таксама ў ведамстве вывучаюць перавагі афрыканскіх краін: цяпер у гэты рэгіён ідуць пробныя пастаўкі беларускай сельгаспрадукцыі.

## У еўрапейскія краіны экспарт вырас у разы

«Адзначу, што наша харчовая прадукцыя працягвае пастаўляцца ў еўрапейскія краіны, і яна там запатрабавана. Па выніках 2022 года мы практычна ў 1,5 раза павялічылі экспарт нашай сельгаспрадукцыі ў краіны Еўрасаюза. Пры гэтым ніякіх абмежаванняў або ўмоўнасцяў паставак беларускай прадукцыі ў Еўрапейскі саюз з нашага боку няма. Вытворцы не збіраюцца зніжаць пастаўкі або наогул ад іх адмаўляцца. Паколькі ў еўрапейскіх краін ёсць патрэба ў нашай прадукцыі, мы працягваем яе экспартаваць», — заявіў Вадзім Шагойка. Ён таксама дадаў, што калі эканамічныя ўмовы з'яўляюцца для Беларусі выгаднымі і прымальнымі, то пастаўкі працягваюць ажыццяўляцца.

Хоць пэўныя лагістычныя складанасці ў гэтым напрамку летась былі. Намеснік міністра нагадаў, што праз санкцыі давялося перабудоўваць маршруты паставак, ствараць новыя лагістычныя ланцужкі. На сёння гэтыя пытанні вырашаны.

«Дзесьці гэта прывяло і да падаражэння лагістыкі, да зніжэння маржынальнасці прадукту. Але гэта не крытычна ў цяперашніх умовах», — падкрэсліў ён.

## Па законе рынку

Тлумачачы рэкордныя вынікі мінулага года, Вадзім Шагойка адзначыў, што шмат у чым гэта адбылося за кошт кан'юнктуры рынку, якая складваецца на карысць Беларусі. Цэны на малочную прадукцыю выраслі больш чым на 30 %, на мясную — практычны рост таксама да 30 %. Акрамя таго, змянілася структура паставак, галіна стала экспартаваць больш высокамаржынальнай прадукцыі. Напрыклад, у частцы мясной прадукцыі перапрацоўшчыкі нарасцілі продаж каўбасных вырабаў, мясных кансерваў і прадукцыі перапрацоўкі. Пры гэтым у параўнанні з 2021 годам скараціліся пастаўкі мяса — туш і паўтуш. Аднак тут нівеліраванне адбылося з прычыны росту сярэдніх коштаў паставак.

Паводле яго слоў, зніжэнне паставак малочнай прадукцыі адбылося з-за перасылак сыравіны для вытворчасці высокамаржынальных прадуктаў. «Так, значна павялічылі экспарт масла і сыроў. Пры гэтым адзначаецца зніжэнне па малаку, вяршках і смятане ў спажывецкай тары, якія першапачаткова мелі больш нізкую маржынальнасць», — адзначыў намеснік міністра.

Вадзім Шагойка нагадаў, што эфектыўнасць паставак прадукцыі аграпрамысловага комплексу на экспарт значна вышэйшая, чым эфектыўнасць продажаў на ўнутраным рынку. Пры гэтым у краіне прыярытэтная ўвага ўдзяляецца забеспячэнню харчаваннем свайго насельніцтва. Асобна прадстаўнік Мінсельгасхарча адзначыў, што беларускія экспарцёры сельгаспрадукцыі працуюць па стапрацэнтнай перадаплаце і запазычанасці па разліках за прадукцыю не маюць.

## Была праблема з упакоўкай

Яшчэ мінулым летам лідар нашай дзяржавы запатрабаваў, каб у Беларусі да канца года пачалі вырабляць уласны ўпаковачны матэрыял для малочных і іншых прадуктаў, бо ў сувязі з санкцыямі заходніх краін праблема з упакоўкай тэтрапак сапраўды існуе. У канцы года кіраўнікі профільнага міністэрства дакладвалі, што дэфіцыт тэтрапаку, які прывёў да зніжэння экспарту беларускага неразведзенага малака за мяжу, удалося пераадолець. Па іх словах, адбылося гэта за кошт паставак ад альтэрнатыўных вытворцаў (у тым ліку з Еўропы).

Намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Вадзім Шагойка нагадаў, што з-за прыпынення паставак упакоўкі ад традыцыйных еўрапейскіх партнёраў беларускім прадпрыемствам прыйшлося знайсці дадатковыя варыянты ў Кітаі і Індыі. Цяпер шматлікія заводы ўжо зрабілі тэставыя разлівы сваёй прадукцыі ў тару ад новых пастаўшчыкоў, якая павінна забяспечыць яе захаванасць на 6, 9 і 12 месяцаў. Аднак, па словах Вадзіма Шагойкі, выпрабавальны працэс патрабуе яшчэ большай колькасці часу, а таму адразу перайсці да замены ўпакоўкі пакуль не магчыма.

«Тэставы разліў прадугледжвае знаходжанне на вытрымку прадукту на гэтыя месяцы плюс яшчэ 20-30 %. Таму раптоўна замяніць упакоўку не атрымліваецца», — заявіў намеснік міністра.

Ён звярнуў увагу, што дзесьці яшчэ дапрацоўваецца ўпакоўка пад абсталяванне на беларускіх прадпрыемствах. «Гэта працэс жывы, ён вырашаецца, і пакуль нейкіх пытанняў не ўзнікае. Вядуцца перамовы з пастаўшчыкамі ўпакоўкі», — адзначыў Вадзім Шагойка.

Ён таксама растлумачыў, што Беларусь ужо не арыентуецца на заходнія кампаніі ў пытаннях забеспячэння тэтрапакам. Аказваецца, прадпрыемствы, якія выпускаюць такую ўпакоўку, ёсць і ў Расіі, але ў нашай краіне па-ранейшаму не адмаўляюцца ад планаў запусціць уласную вытворчасць.

Раней прадстаўнікі канцэрна «Беллеспаперапрам» паведамлялі, што ў свеце існуе ўсяго 5-6 кампаній, якія валодаюць тэхналогіямі стварэння ўпакоўкі тыпу тэтрапак. У прыватнасці, асаблівы кардон, які з'яўляецца сыравінай для яе вытворчасці, робяць у нашай краіне на Добрушскай папяровай фабрыцы. Зараз ідзе працэс пошуку інвестараў для самастойнай вытворчасці.

## Трэба мадэрнізаваць цяплічныя гаспадаркі

Якія меры ў нашай краіне будуць прымацца для вырошчвання гароднiны ў міжсезонны перыяд? Пытанне цікавае.

Гаворачы аб магутнасцях па вытворчасці агароднiннай прадукцыі, Вадзім Шагойка падкрэсліў, што ў нашай краіне дастаткова плошчаў цяплічнай гаспадаркі і вырашчанай у адкрытым грунце прадукцыі, каб у цэлым па годзе забяспечыць насельніцтва на 100 %.

«Аднак застаецца адкрытым пытанне забеспячэння насельніцтва гароднінай у міжсезонне. Не ўсе нашы цяпліцы абсталяваны сучаснымі тэхналогіямі дасвятлення, якія патрэбны для вырошчвання агуркоў і памідораў з лістапада да лютага. Таму менавіта ў гэты перыяд мы імпартуем дадзеную прадукцыю», — растлумачыў намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання.

Пры гэтым, паводле яго слоў, урад цяпер паставіў задачу мадэрнізаваць нашы цяплічныя гаспадаркі — па магчымасці абсталяваць іх тэхналогіямі святлакультуры і дадаткова пабудаваць новыя сучасныя цяпліцы.

«Адзначу, што, нягледзячы на пэўныя пытанні ў міжсезонны перыяд, летам і восенню наша гародніна экспартуецца. Аднак пакуль айчынная вытворчасць перабудоўваецца, імпарт прадукцыі, якая адсутнічае, у міжсезонне працягнецца», — сказаў на заканчэнне Вадзім Шагойка.

**Сяргей КУРКАЧ.**


Уважаемые акционеры

**ОАО «Стройтрест №3 Ордена Октябрьской революции»!**

**31 марта 2023 года в 14.30**

СОСТОИТСЯ ГОДОВОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

Место проведения собрания: г. Солигорск, ул. Козлова, 37, административное здание Общества, 2-й этаж, актовый зал.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2022 год и основных направлениях деятельности Общества на 2023 год.
2. Отчет наблюдательного совета о работе в 2022 году.
3. Отчет ревизионной комиссии о работе в 2022 году, рассмотрение результатов ежегодной ревизии – по результатам финансовой и хозяйственной деятельности Общества за 2022 год.
Рассмотрение аудиторского заключения по итогам проведения ежегодного аудита Общества за 2022 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках, распределение прибыли и убытков Общества за 2022 год.
5. План распределения чистой прибыли Общества на 2023 год.
6. Определение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. Внесение изменений в Устав Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться с 11 по 30 марта 2023 г. с 10.00 до 16.00 (перерыв на обед – с 13.00 до 14.00) по месту нахождения Общества: г. Солигорск, ул. Козлова, 37, 3-й этаж, кабинет 320. В день проведения собрания 31 марта 2023 года – по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания – с 14.00 до 14.30.

При себе иметь: акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Список акционеров будет сформирован по состоянию на 01.03.2022 года.

*Наблюдательный совет (8-0174-26-04-46)*

УНП 600122771



**ЗАО «БелБанкротАукцион»,**
организатор торгов по продаже имущества
**УП «Пинская СПМК-5»** (УНП 200111234),
объявляет о проведении **31.03.2023 г.** с 9.00 до 16.00
на электронной торговой площадке bankrottorg.by
электронных торгов в форме аукциона

**Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2023/02/spisok-imushhestvapmk-1.pdf**

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296569865, Виктор.

Продавец: УП «Пинская СПМК-5».

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо оплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее **30.03.2023** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 **01.03.2023** по 17.00 **30.03.2023** на bankrottorg.by. К заявке на участие в торгах прилагаются (для юридических лиц) и направляются в отсканированном виде по адресу: contact@bankrottorg.by следующие документы:
- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета электронных торгов, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за 5 дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: за размещение объявления о проведении торгов в базе данных ЕГРСБ 120,00 бел. руб., возмещение за оценку по лотам №№ 1–4 – 4956,59 бел. руб. пропорционально по каждому лоту, по лоту № 5 – 24,74 бел. руб., по лоту № 6 – 64,15 бел. руб., стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре, аукционный сбор по лотам №№ 1, 3 – 3 % от цены реализации имущества без учета НДС (НДС 20 %), по лотам №№ 2, 4 – 7 % от цены реализации имущества без учета НДС (НДС 20 %), по лотам №№ 5, 6 – 5 % от цены реализации имущества без учета НДС (НДС 20 %).

Срок подписания договора купли-продажи: в течение 10 календарных дней со дня проведения аукциона.

Срок оплаты по договору купли-продажи: в течение 30 календарных дней с даты проведения электронных торгов.



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «МТЗ» (Продавец)**

Аукцион состоится **20.03.2023** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Лот № 1 в составе:**

1. **Административное помещение,** инв. № 500/D-798795724, 1955 г.п., г. Минск, ул. Олега Кошевого, 3-4.

2. **Подвальное помещение административного здания** по ул. Олега Кошевого, 3, инв. № 500/D-978819832, 1955 г.п., г. Минск, ул. Олега Кошевого, 3-1.

Начальная цена – 2618044,00 руб.

Задаток – 300000,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатка – 16.03.2023 в 11.00.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

Весткі з месцаў

# Мова продкаў? Мова нашчадкаў!

**Пад канец лютага ў нашым дзіцячым садку штогод пачынаецца свята. Вось і сёлета напярэдадні Дня роднай мовы ў сярэдніх і старшых групах прайшлі тэматычныя заняткі, на якіх дзеці даведаліся аб значэнні мовы для кожнага народа. А далей...**



Конкурс малюнкаў «Паэзія вачамі дзяцей» даў магчымасць кожнаму выхаванцу пабыць мастаком-ілюстратарам (найлепшыя работы былі прадстаўлены на выставе); нашы выхавальніцы Вольга Даніленка і Марына Барысава разам са старэйшымі дзеткамі падрыхтавалі для малодшых драматызацыю беларускіх казак «Зайкава хатка», «Коцік, пеўнік і лісіца». Цікавасці і задору, як заўжды, дадалі беларускія рухомыя гульні — і ў спартыўнай зале, і на вуліцы.

А кульмінацыяй сталі госці. У папярэднія гады імі былі паэты Міхаіл Болсун, Галіна Рагавая, Вера Квяткоўская, а гэтым разам — сябра Беларускіх саюзаў журналістаў і пісьменнікаў Ганна Атрошчанка. Яна расказала пра сваю творчасць, прачытала некалькі вершаў. Дзеці таксама падрыхтаваліся да сустрэчы з паэткай: яны бралі ўдзел у конкурсе юных чытальнікаў «На роднай мове гавару я».

Убаку не засталіся і бацькі нашых выхаванцаў. Яны актыўна ўключыліся ў гульню «Перакладчыкі» і паказалі добрае веданне першай дзяржаўнай мовы...

А наогул, калі гучаць прыгожыя вершы і песні, калі выконваюцца нашы народныя танцы, калі з вуснаў дзяцей ліецца родная мова, — і сапраўды ствараецца свята.

**Ала Грыб,**
**загадчыца дзіцячага сада № 161.**
*г. Гомель.*

# Таленты трэба падтрымліваць...

**«Альшанскі переазвон» — так у нашай школе назвалі літаратурную суполку, потым — свой альманах. Зараз да друку рыхтуецца ўжо пяты выпуск**

**А пачалося ўсё з таго, што 2019-ы быў абвешчаны Годам малой радзімы, і Эме Уладзіміраўне Урублеўскай, настаўніцы беларускай мовы і літаратуры, вучні прынеслі свае першыя вершы... Следам узнікла ідэя надрукаваць іх, прысвяціўшы малой радзіме — мікрараёну Альшанка.**




Над зборнікам, акрамя Эмы Уладзіміраўны, плённа папрацавалі настаўнікі выяўленчага мастацтва і інфарматыкі, таму кніжка (да радасці, да гонару дзяцей!) атрымалася яркая, цёплая, з фотаздымкамі аўтараў, з малюнкамі школьных мастакоў...

На яе прэзентацыі прысутнічалі пісьменнікі Людміла Кебіч, Ганна Скаржынская-Савіцкая, паэтка Вікторыя Смолка, крытык, паэт і празаік Дзмітрый Радзівончык... Цяпер гэтыя ды іншыя літаратары — частыя госці школы.

Акрамя таго, нашы «пераразвонаўцы» запрашаюцца на пасяджэнні грамадскага дыскусійнага клуба «Словадром», дзе нароўні з дарослымі прадстаўнікамі культурнай і інтэлектуальнай эліты бяруць удзел у абмеркаванні актуальных пытанняў, наведваюць літаратурную школу пры Гродзенскім абласным аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Такое плённае супрацоўніцтва прывяло да стварэння ў школе кабінета-музея «Літаратурны Гродна», дзе, апроч шафы са зборнікамі твораў пісьменнікаў-землякоў (з аўтографамі), размешчаны стэнд з вершамі, апавяданнямі вучняў, іх дыпломы і граматы за перамогі ў раённых, абласных і рэспубліканскіх літаратурных конкурсах.

Варта адзначыць цікавасць вучняў да творчасці, рост іх майстэрства. У прыватнасці, выпускніца школы Ніка Статкевіч стала дыпламантам IV Міжнароднага фестывалю-конкурсу паэзіі і паэтычных перакладаў «Берагі дружбы».

...Кажуць, той, хто мае здольнасці, заўсёды прабʼецца.

Той, хто ўжо «прабіўся», ведае, як жа патрэбна была падтрымка!

**Ірына Салата,**
**настаўніца СШ № 39,**
*г. Гродна.*

Людзі і лёсы

# СПРАВА ЖАНЧЫНЫ — ЧАКАЦЬ?

**Вайскоўцы — людзі вандроўныя: гэта значыць, што сёння яны вось тут, а дзе заўтра — ніхто не ведае**

**У 80-я гады мінулага стагоддзя нам давялося служыць ва Узбекістане. Клімат там зусім не наш: паўгода бязбожнай спякоты! Вада з Каракумскага канала амаль рудая (пілі яе толькі гатаванай, а бялізну пралі, накруціўшы на кран анучу, бо іначай — ці мыў, ці не мыў...). Яек не елі, бо курэй там ніхто не трымаў, свініны (мусульмане!), вядома ж, — таксама. Бульбу нам прывозілі з Башкірыі — на сям'ю два мяшкі. Алей у каністрах па дваццаць літраў, каб хапіла на год, адпраўлялі багажом з радзімы.**

Але ж пры гэтым мы былі маладыя і ні на што не скардзіліся, пакуль...

У тую раніцу мой муж (афіцэр-сувязіст) збіраўся на службу, я — у школу на работу, сын — у дзіцячы садок. Мы разам выйшлі на вуліцу і аслупянелі: усюды стаялі палаткі колеру хакі, ваенная тэхніка, віравалі людзі, гудзеў аэрадром.

На душы стала трывожна і страшна, бо гэта ж, відаць, нездарма? І сапраўды: пачынаўся ўвод савецкіх войск у Афганістан.

Баявыя дзеянні — па традыцыі — справа мужчын. Абавязак іх жонак — гадаваць дзяцей і чакаць.

Лёгка гэтак сказаць, а вось зрабіць...

Людміла Юр'еўна Патапава, выпускніца Варашылаўградскага машынабудаўнічага інстытута, у той час толькі пачынала працаваць хімікам-тэхнолагам на Лісічанскім содавым заводзе. Яе муж — вайсковец — вось-вось павінен быў атрымаць кватэру, а замест гэтага атрымаў загад, згодна з якім у складзе так званага абмежаванага кантынгенту савецкіх войск трапіў у Афганістан.

Людміла вельмі перажывала за мужа, амаль штодня пісала яму лісты і — хай не так часта — атрымлівала адказы, але трывога за здароўе і жыццё каханага ніколі яе не пакідала.

А тут яшчэ на завод прыйшлі прадстаўнікі ваенкамата, сталі расказваць, што ахвотныя могуць паехаць у Афганістан, зарабіць грошай, атрымаць ільготы...

Людміла стала падумваць: а можа, і сапраўды?

Яе свякроў аказалася больш рашучай. У трывозе за жыццё свайго адзінага сыночка яна адразу ж прапанавала нявестцы: «Едзь!.. Яму там цяжка. Ты — жонка, ты павінна быць побач».

...Усе неабходныя дакументы ёй афармілі вельмі хутка, пасля чаго і пачалася досыць доўгая дарога на вайну: самалётам да Ташкента, адтуль — да Кабула, верталётам да Баграма.

У красавіку 1985-га там было пекла: тэмпература як у духоўцы, усюды пясок, нідзе ніводнага зялёнага дрэўца.

Здзіўлялі жанчыны (усе ў шырокіх каляровых шараварах, замест сукенак — паранджа) і дзеці — напаўголыя, мурзатыя... Здавалася, што ў кожнай сям'і іх добры дзясятак... Жабравалі бедныя... Нашы вайскоўцы, каб ніхто не бачыў (кантакты з мясцовымі былі забаронены), здараліся, частавалі іх галетамі, цукрам, хлебам.

...Людміла пайшла працаваць па спецыяльнасці на склад гаруча-змазачных матэрыялаў. Для пражывання ім з Юрыем выдзелілі маленькі і далёка не новы модуль. Давялося, што называецца, закасаць рукавы і за два дні пераўтварыць яго амаль у «люксаўскі» нумар гасцініцы.

Да пастаянных перастрэлак яна таксама хутка прывыкла, у аснуўным таму, што ёй трэба было шмат працаваць (забяспечваць запраўкі якасным палівам). Да таго ж усе думкі былі пра мужа. Юра пастаянна прападаў у раз'ездах, суправаджаў аўтамабільныя калоны з палівам па ўсім Афганістане. Тыдзень яна чакала яго з Джэлалабада, тыдзень — з Хумры, затым — з Баграма... Кожны дзень яна маліла Бога, каб толькі б вярнуўся, бо многія...

Сэрца рвалася ад болю, калі на месца дыслакацыі прывозілі параненых, а яшчэ горш — забітых. Адпраўляючы іх на радзіму ў цынкавых трунах, развітваліся, як з самымі роднымі...

Ім з Юрам пашчасціла: засталіся ў жывых, хоць дарога дамоў была яшчэ досыць доўгая. Ім давялося паслужыць у Туркменістане і ўжо адтуль вярнуцца ў Беларусь.

Юрый Патапаў звольніўся ў запас у званні падпалкоўніка і цяпер працуе на аўтатранспарце, Людміла пайшла ў бухгалтары. Яна вельмі працавітая і добразычлівая, спагадная да людзей. Што, напэўна, нядзіўна, калі ёй да сёння сніцца вайна?

**Ніна Горгуль,**
*г. Мінск.*

Ёсць пытанне

# Усё мяняецца...

**На пачатку сямейнага жыцця муж хваліць сваю абранніцу ну як толькі можа! Маўляў, яна ў яго і прыгожая, і разумная, і працавітая, і акуратная, і такая ўжо гаспадынька...**

Жонка таксама не адстае, кажа, што муж яе — самы-самы: добры, клапатлівы, дужы, смелы, умелы...

У час разводу (а здараецца, што не прайшло і паўгода) гэтыя «расповеды» вельмі мяняюцца. Яна ўжо... «выдра», гультайка, дурніца і неахайніца, ён — «асёл», «казёл, эгаіст і п'яніца...

Цікава, што ж адбылося, хто іх абодвух так сапсаваў?

**Вольга Фядзяшына,**
*г. Слуцк.*

Чалавек — чалавеку

# СВЕТ БЫЎ І БУДЗЕ НЕДАСКАНАЛЫ

**...Як заўважыў мудры Станіслаў Лем, людзям заўсёды дрэнна. Той, хто шукае спакою, цішыні ды лагоднасці, знойдзе ўсё гэта, але... на могілках. Прысспешваць той час — справа, па-моіму, апошняя: пакуль жывецца, трэба жыць.**

Нехта можа спытаць, а як, калі навокал мора трывог і негатыву, калі на душы — як цяпер за вокнамі: хмарна, холадна, сыра?

Універсальнага адказу на гэтае пытанне, бадай, няма. Для пачатку мо трэба ўсвядоміць, што свет і быў, і ёсць, і будзе недасканалы. Значыць, не варта чакаць, пакуль настане гармонія. А вось захаваць яе ў сабе, у сваёй сям'і можна (бо хто, калі не мы?).

Для гэтага, на мой погляд, па-першае трэба імкнуцца да зносін з добрымі людзьмі і найперш аптымістамі; па-другое, калі ёсць магчымасць, тварыць, чытаць, а то і перачытваць любімыя кнігі, прасякнутыя дабрынёй і гумарам, глядзець найлепшыя фільмы; па-трэцяе, знаходзіць спакой і натхненне ў зносінах з прыродай, бо гэта заўсёды дарыла і дорыць чалавеку добры настрой.

Хтосьці можа спытаць: «А ці не ўцёкі гэта ад рэальнасці?» Вядома ж, не, бо з сябрамі-аптымістамі можна абмяркоўваць тое, што хвалюе ўсіх і кожнага, бо кнігі і добрыя фільмы дапамагаюць не губляць надзеі і веры ў лепшае, даюць адказы на многія пытанні, бо прырода заўсёды дарыла і дорыць чалавеку цудоўны настрой.

...У маім жыцці, як, напэўна, у кожным, бываюць палосы як святлейшыя, так і, на жаль, цямнейшыя, а то і наогул — часіны тугі і адчаю. Іх — каб нікога не засмучаць — я стараюся перажыць сам-насам.

А яшчэ ў такія моманты прыходзіць думка, што як бы ні было дрэнна, камусьці — яшчэ горш, бо ні адзін чалавек не жыве без страт, без хвароб, без цяжкасцяў. І неяк жа людзі спраўляюцца, неяк адольваюць гора, свае недахопы і слабасці, захоўваюць уласнае аблічча...

Яны могуць, значыць, зможам і мы.

**Ірына Матусевіч,**
*Дзяржынскі раён.*

# Мясцовае самакіраванне

1 сакавіка 2023 г. № 8 (694)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# З УВАГАЙ ДА КОЖНАГА ЧАЛАВЕКА



## З якімі пытаннямі падчас чарговага прыёму грамадзян звярталіся да Наталлі КАЧАНАВАЙ





Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Гэтым разам спікер верхняй палаты парламента ажыццяўляла прыём у Савеце Рэспублікі. Традыцыйна ахвотных данесці да Старшыні Савета Рэспублікі свае праблемы было вельмі шмат. Працоўны дзень ужо даўно скончыўся, а людзі ўсё ішлі — у выніку прыём доўжыўся каля 12 гадзін. Паляпшэнне жыллёвых умоў, працоўныя адносіны, падаткаабкладанне, жыллёва-камунальная гаспадарка, ахова здароўя — далёка не ўсе пытанні, з якімі звярталіся мінчане і не толькі.**

### Праблемы ў выхаванні асаблівага дзіцяці

Жыхарка сталіцы Марына Бялкова агучыла пытанне развіцця сістэмы адукацыі для дзяцей з асаблівымі адукацыйнымі патрэбамі. Жанчына расказала, што, акрамя ўласных дваіх дзяцей, разам з мужам яна выхоўвае яго дачку ад першага шлюбу. Дзяўчынка — з асаблівасцямі развіцця. Марына Віталеўна паведаміла пра шэраг праблем, з якімі сутыкнулася падчас яе выхавання. У прыватнасці, яна паскардзілася на тое, што персанальнае суправаджэнне ва ўстановах адукацыі ажыццяўляецца ў адносінах да дзяцей з вузкім спектрам дыягназаў. Аднак, па яе словах, праблемы ў паводзінах праяўляюцца і пры іншых захворваннях.

— Маючы дзіця з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, кожны дзень ты праходзіш шлях, які падобны на квэст, — падзялілася мачаха дзяўчынкі. — У першую чаргу гэта датычыцца выбару адукацыйнага маршруту для дзіцяці, каб хутчэй інтэграваць і сацыялізаваць яго ў навучальных установах. Як маці я хачу, каб маё дзіця было паўнавартасным членам грамадства. А каб інтэграваць дзіця ў звычайную школу, нам патрэбен памочнік, які будзе яго суправаджаць, — чалавек-цьютар.

Наталля Качанава пацікавілася, колькі гадоў дзяўчынцы, які ў яе дыягназ. Дзіцяці 11 гадоў. Праблемы, па словах жанчыны, пачаліся стыхійна — пасля перанесенай ковід-інфекцыі. Дагэтуль у дзяўчынкі былі некаторыя маўленчыя асаблівасці, пасля каранавіруса яна страціла навыкі самаабслугоўвання, зноў вучылася чытаць, пісаць...

— Чым мы можам вам дапамагчы? — удакладніла Наталля Качанава. Спікер верхняй палаты парламента расказала, што Савет Рэспублікі вельмі шчыльна займаецца комплексным вырашэннем праблемы інклюзіі ў адукацыі, адаптацыі дзяцей з асаблівасцямі развіцця ў грамадстве. Акурат у сакавіку ў Полацку адбудзецца семінар, на якім будуць уздымацца пытанні навучання дзяцей з захворваннямі. А паколькі гэтая тэма хвалюе заяўніцу, спікер запрасіла яе паўдзельнічаць у семінары.

стар. 8

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

## Зваротная сувязь, міжнародныя зносіны і ўдасканаленне заканадаўства



• Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава правяла нараду з кіраўніцтвам сталіцы. У ёй узялі ўдзел міністр унутраных спраў, упаўнаважаны прадстаўнік Прэзідэнта ў Мінску Іван Кубракоў, памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектар па Мінску Аляксандр Барсукоў, старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў, намеснікі старшыні Мінгарвыканкама, кіраўнікі адміністрацый раёнаў горада. Падчас нарады быў абмеркаваны шырокі спектр пытанняў, якія датычацца забеспячэння жыццядзейнасці сталіцы, а таксама арганізацыі разгляду зваротаў грамадзян, у тым ліку прынятых у ходзе асабістага прыёму грамадзян спікерам верхняй палаты парламента.

• Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец узяла ўдзел у абмеркаванні пытанняў эканамічнай бяспекі краіны, якое адбылося ў рамках праекта «Дэпутацкі клуб». Удзельнікі сустрэчы акцэнтавалі ўвагу на асноўных выніках работы прамысловага комплексу сталіцы ў 2022 годзе, вызначылі ключавыя задачы на 2023 год у кантэксце эканамічнай бяспекі краіны. Як адзначыла Таццяна Рунец, удзельная вага Мінска ў валавым унутраным прадукце краіны складае 30 %, у аб'ёме прамысловай вытворчасці — 16 %, інвестыцый у асноўны капітал — 20 %. Такая высокая канцэнтрацыя эканамічнай актыўнасці, па яе словах, прад'яўляе асаблівыя патрабаванні да ўстойлівай работы сталічных прадпрыемстваў для забеспячэння эканамічнай бяспекі ўсёй краіны.

• Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей Сівец правёў прамую тэлефонную лінію, падчас якой да сенатара паступіла шэсць тэлефонных званкоў. Пытанні, з якімі звярталіся грамадзяне, датычыліся заканатворчай дзейнасці, рэалізацыі права на памілаванне, абскарджання і выканання судовых пастаноў. Былі сярод тых, хто тэлефанаваў, і нязгодныя з рашэннямі мясцовых органаў улады. Парламентарый даў неабходныя кансультацыі, у тым ліку растлумачыў парадак звароту ў органы пракуратуры, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, а таксама механізм абароны правоў у судовым парадку.

• Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Валерый Бельскі ўзяў удзел у анлайн-сустрэчы з дэпутатамі парламенцкай групы «Мексіка — Беларусь» Палаты дэпутатаў Генеральнага кангрэса Мексіканскіх Злучаных Штатаў. Валерый Бельскі падкрэсліў неабходнасць актывізацыі міжпарламенцкага ўзаемадзеяння Беларусі і Мексікі, звярнуў увагу на рэальныя магчымасці для ўмацавання беларуска-мексіканскага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, пашырэння гуманітарных кантактаў, развіцця культурных, адукацыйных, турыстычных сувязяў. Бакі дамовіліся аб сумеснай падтрымцы прасоўвання пытання аб узаемным адкрыцці пасольстваў у сталіцах двух дзяржаў.

• Члены Прэзідыума Савета Рэспублікі Ірына Старавойтава і Таццяна Рунец удзельнічалі ў пасяджэнні калегіі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, якое праходзіла на базе УП «Святлоприбор» Беларускага таварыства інвалідаў па зроку. Асноўнае пытанне, вынесенае на абмеркаванне, датычылася вынікаў работы сістэмы міністэрства ў 2022 годзе, задач на сёлета. Як заўважыла старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, у 2022 годзе была праведзена значная работа па ўдасканаленні заканадаўства ў сацыяльна-працоўнай сферы. «Савет Рэспублікі адобрыў чатыры законапраекты, арыентаваныя на падтрымку насельніцтва, абарону правоў грамадзян з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, — нагадала Таццяна Рунец. — Прыняты новы для нашай краіны Закон «Аб аб'яднаннях наймальнікаў». Але, нягледзячы на тое, сацыяльны парадак дня заканадаўцаў застаецца вельмі насычаным. Нас чакае сумесная з Мінпрацы і сацабароны работа над законапраектам, які прадугледжвае карэкціроўку законаў па пытаннях сацыяльнага абслугоўвання. Важна, каб прапанаваны пакет навел быў сапраўды запатрабаваны насельніцтвам, каб гэта не стала нейкім фармальным удасканаленнем заканадаўства для справаздачы».

**Вераніка КАНЮТА.**

**Наталля КАЧАНАВА:**

# «Людзі падтрымліваюць палітыку, якая накіравана на стваральную працу»

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава сустрэлася з актывам Ленінскай раённай арганізацыі горада Бабруйска рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь». Па традыцыі падобных мерапрыемстваў, сустрэча прайшла ў фармаце адкрытага дыялогу, шчыра і па-сяброўску.**

Наведванне Савета Рэспублікі і сустрэча з Наталляй Качанавай стала кульмінацыяй другога Форуму развіцця грамадзянскай супольнасці «Мы Разам», які пачаў сваю работу ў Бабруйску на мінулым тыдні. Ініцыятарам форуму стала Ленінская раённая арганізацыя Бабруйска РГА «Белая Русь». Сем дзён у Бабруйску працавалі дыялогавыя пляцоўкі з удзелам моладзі, ветэранаў, прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў.

Старшыня Савета Рэспублікі падзякавала актывістам і за ініцыятыву сустрэцца ў сценах верхняй палаты парламента. «Я шчыра рада таму, што прадстаўнікі «Белай Русі» прысутнічаюць у Савеце Рэспублікі. Для нас такія сустрэчы вельмі важныя», — адзначыла Наталля Качанава.

«Наведванне Савета Рэспублікі для нас — вельмі значная падзея. Сустрэча з Наталляй Іванаўнай для кожнага з нас дарагога варта. Такія сустрэчы даюць зарад тых эмоцый, якіх не хапае ў рэгіёнах. Наталля Іванаўна — спікер з вялікай літары, кожнае яе слова прасякнута любоўю да Радзімы. А мы тая грамадская арганізацыя, якая стаіць на абароне правоў і інтарэсаў нашых грамадзян і любові да нашай радзімы. Гэта выдатная магчымасць абгаварыць тыя пытанні і праблемы, якія назапасіліся ў нашым рэгіёне», — падзялілася ў размове з журналістамі **Ірына РУСАКОВІЧ, старшыня Ленінскай раённай арганізацыі горада Бабруйска рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь».**

Спектр пытанняў, якія былі абмеркаваны на сустрэчы са спікерам верхняй палаты парламента, досыць шырокі. На першым плане — грамадскае аб'яднанне «Белая Русь», перспектывы яго развіцця, роля ў жыцці краіны. Не пакінулі без увагі захаванне гістарычнай памяці, выхаванне патрыятызму ў маладога пакалення. Размаўлялі і аб надзённых пытаннях — цэнаўтварэнні, падаткаабкладанні, сямейных каштоўнасцях. У сценах Савета Рэспублікі немагчыма не гаварыць пра заканадаўства. Удзельнікі сустрэчы абмеркавалі законапраект «Аб народным апалчэнні», Закон «Аб палітычных партыях і грамадскіх арганізацыях», Закон «Аб Усебеларускім народным сходзе» і іншыя дакументы, якія вызначаюць жыццё краіны.

«У нас вельмі насычанае палітычнае жыццё. І калі раней людзі не былі так моцна ўцягнуты ў палітычнае жыццё сваёй краіны, то цяпер актыўна ўключаюцца ў гэтую работу. Людзі падтрымліваюць палітыку, якая праводзіцца ў нашай краіне і якая накіравана, перш за ўсё, на стварэнне, на чалавека працы», — заўважыла Наталля Качанава.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# З УВАГАЙ ДА КОЖНАГА ЧАЛАВЕКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Агучыла Марына Віталеўна і яшчэ адну праблему, звязаную з выхаваннем асаблівага дзіцяці. Паколькі родная маці ад дзяўчынкі адмовілася, апеку над ёй узяў родны бацька. Але ў сувязі з тым, што муж шмат працуе, рэгулярна з'язджае ў камандзіроўкі, большасць часу з дзяўчынкай праводзіць яна, мачаха. Нярэдка здараюцца моманты, калі паўстае пытанне заканадаўчага прадстаўніцтва. Напрыклад, калі дзяўчынка наведвае псіхіятра, паведамляць пэўную інфармацыю ўрачы проста не маюць права. Аднак большасць часу з хворым дзіцем праводзіць менавіта яна, таму заяўніца лічыць, што павінна паўнавартасна прымаць удзел у жыцці прыёмнай дачкі.

Старшыня Савета Рэспублікі пацікавілася, чаму яе родная маці не пазбаўлена бацькоўскіх правоў. Як высветлілася, жанчына не хоча ні ўдзельнічаць у выхаванні сваёй дачкі, ні адмаўляцца ад правоў на яе. Наталля Іванаўна звярнула ўвагу, што сітуацыя вельмі няпростая, і ўхваліла намер мінчанкі ўзяць дзяўчынку сабе, выхоўваць яе як родную дачку. У сувязі з гэтым спікер верхняй палаты парламента дала даручэнне паглядзець на сям'ю сапраўднай маці дзяўчынкі з асаблівасцямі: у першую чаргу, з мэтай даведацца, як яна адносіцца да іншых сваіх дзяцей. Акрамя таго, Наталля Качанава паабяцала заяўніцы, што спецыялісты аховы здароўя правядуць комплекснае абследаванне дзіцяці для ўстанаўлення канчатковага дыягназу. Што датычыцца апякунства мачахі над дзяўчынкай, спікер заўважыла, што сітуацыя неардынарная. Па яе словах, пад кожны выпадак закон не прапішаш, аднак на тое, што можна ўдасканаліць, парламентарыі абавязкова звернуць увагу.

У размове з журналістамі Марына Бялкова адзначыла, што вельмі ўдзячная Наталлі Іванаўне, якая пагадзілася выслухаць, паглыбіцца ў іх праблемы і прапанаваць шлях вырашэння.

## Служыць ці не?

Алена Капыток прыехала на прыём грамадзян са Слуцка. Жанчына расказала, што яе муж да нядаўняга часу працаваў у Следчым камітэце горада. Калі ў яго пачаліся сур'ёзныя праблемы са здароўем, мужчына напісаў рапарт, што працягвае кантракт не будзе. Праз некаторы час яму патэлефанавалі з кадравай службы і папрасілі перапісаць рапарт па стане здароўя, пераканаўшы, што ў любым выпадку рашэнне будзе прымаць кіраўнік падраздзялення. У выніку муж заяўніцы быў звольнены са службы па стане здароўя. Аднак гэтае рашэнне не задавальняе ні самога мужчыну, у якога за плячамі — 25 гадоў службы, ні яго сям'ю.

Як паведамілі прадстаўнікі кадравай службы Следчага камітэта, што прысутнічалі на прыёме грамадзян, па заключэнні ваенна-ўрачэбнай камісіі мужчына, пра якога ідзе гаворка, не прыдатны да службы па канкрэтных групах здароўя. Следчы камітэт і тая пасада, дзе мужчына праходзіў службу, адносіцца да іншых груп — гэта значыць, калі б муж заяўніцы працягваў служыць, то ён меў бы права займаць ранейшую пасаду. «Медыцынскія органы выносяць заключэнне — мы яго рэалізоўваем», — давялі пазіцыю па гэтым пытанні прадстаўнікі кадравай службы.

Алена Капыток паведаміла, што яе муж у такім становішчы, што выконваць ранейшыя абавязкі проста не зможа. Наталля Качанава дала даручэнне правесці медыцынскае абследаванне яшчэ раз. «І калі будзе прынята рашэнне, што ён прыдатны — з гіпертанічнымі крызамі, з псарыязам цяжкай формы, — то вы разумееце, што паўплываць на нешта я ўжо не змагу», — паведаміла заяўніцы Старшыня Савета Рэспублікі. Пры гэтым Наталля Качанава звярнула ўвагу на некарэктнасць супрацоўнікаў кадравага падраздзялення, якія прасілі перапісаць заяву, абнадзеілі людзей, што так будзе лепш, а потым далі адваротны ход.



## А лепш бы — па-добраму

Вельмі эмацыянальна пра сваю праблему расказала Зінаіда Запруцкая, якая жыве ў вёсцы Нежаўка, што ў Чэрвеньскім раёне. Жанчына паскардзілася, што яе незаконна звольнілі з работы, хоць да пенсіі ёй заставаўся год і чатыры месяцы. Пры гэтым заяўніца паведаміла, што на прадпрыемстве, дзе яна працавала, няправільна налічвалі заработную плату, паскардзілася і на прадузятае стаўленне кіраўніцтва да людзей.

Апошнія сем гадоў Зінаіда Мікалаеўна была вартаўніком складоў са збожжам (усяго стаж работы — каля 40 гадоў) на адным з прадпрыемстваў раёна. Са сваёй напарніцай працавалі па графіку «суткі праз суткі». Не раз жанчыны звярталіся



да дырэктара прадпрыемства, скардзіліся, што ў такім рэжыме працаваць вельмі цяжка. І хоць бы яшчэ грошы за гэта плацілі! У дырэктара быў адзін адказ: «Не падабаецца — сыходзьце».

— А куды сыходзіць?! — кажа жанчына. — У нас паблізу няма ніякай работы. А да пенсіі дапрацаваць трэба. За сем гадоў сышлі тры мужчыны — нават яны не вытрымалі такога графіку. Пазней мы дабіліся, што нам далі яшчэ двух чалавек, і пачалі працаваць суткі праз трое. Пры гэтым заробак застаўся ранейшы — капейка ў капейку.

Выслухаўшы жанчыну, Наталля Качанава абурылася, як чалавека маглі звольніць, калі яму засталося да пенсіі ўсяго год і чатыры месяцы. І чаму працу дваіх чалавек аплачвалі гэтак жа, як і чатырох, — атрымліваецца, вартаўнікам, якія працавалі ўдвух, проста не даплачвалі?! Акрамя таго, у заяўніцы вылічвалі ў казну прадпрыемства грошы за пабітую яе сынам, які загінуў у аварыі, фуру — у выніку на рукі Зінаіда Мікалаеўна атрымлівала 200 рублёў. А цяпер няма і гэтых грошай. Муж-інвалід не працуе, таму разлічваць больш няма на каго.

Жыхарка Чэрвеньшчыны паскардзілася Наталлі Іванаўне і на тое, што звольнілі яе незаконна. Спачатку дырэктар прадпрыемства дазволіў жанчыне ўзяць блокі, якія падлягалі ўтылізацыі, а потым выклікаў міліцыю і абвінаваціў у крадзяжы. У выніку жанчыну звольнілі па артыкуле. «Пачала шукаць свае правы і стала ворагам нумар адзін на ўвесь калгас», — заўважыла Зінаіда Мікалаеўна.

— Дзе Зінаідзе Мікалаеўне дапрацаваць да пенсіі? — пацікавілася Наталля Качанава ў дырэктара філіяла «Мінскжалезабетон», які прысутнічаў на прыёме грамадзян. — Яна што, п'яніца, не грамадзянка нашай краіны? Пакарайце, аб'явіце вымову, навошта адразу звальняць? І што гэта за заробак такі, што чалавек атрымлівае менш, чым мінімальная заработная плата, пры гэтым яму не даплацілі? Як чалавеку жыць, раскажыце?

Дырэктар прадпрыемства паведаміў, што не даваў дазволу на вываз блокаў. Таксама ён адзначыў, што прапаноўваў жанчыне ўладкавацца на работу ў іншы калгас, аднак яна адмовілася. На гэта спікер верхняй палаты ўдакладніла, як у такім выпадку Зінаідзе Мікалаеўне ездзіць у суседні калгас, калі ў яе дома знаходзіцца муж-інвалід і за ім патрабуецца догляд.

У размове выплыла і тое, што некаторыя супрацоўнікі прадпрыемства прыходзяць на работу ў стане алкагольнага ап'янення, на што кіраўніцтва заплюшчвае вочы. Старшыня Савета Рэспублікі патрабавала навесці ў гаспадарцы парадак і паабяцала арганізаваць праверку дзяржаўнымі органамі. Абавязковае патрабаванне да кіраўніка прадпрыемства — вырашыць пытанне па працаўладкаванні заяўніцы і стварэнні магчымасці дапрацаваць да пенсіі. Асобнае даручэнне па лініі МУС — разабрацца па факце крадзяжу, якога, калі верыць заяўніцы, не было. Напрыканцы Наталля Качанава парэкамендавала маладому кіраўніку прадпрыемства шукаць да людзей падыход і па-добраму да іх адносіцца.

## Метры квадратныя

Мінчанін Яўген Баешка падчас прыёму грамадзян узняў жыллёвае пытанне. Малады чалавек — інвалід І групы. Ён пацікавіўся, ці можа разлічваць на ўласнае жыллё. На цяперашні момант Яўген жыве разам з бацькамі і малодшай сястрой. Жылая плошча кватэры, у якой яны жывуць, — 40,7 квадратных метра.

Як увеў у курс справы **намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Генадзь ТРУБІЛА**, які прысутнічаў на прыёме грамадзян, калі сукупны даход сям'і не перавышае бюджэту пражытковага мінімуму, то малады чалавек мае права стаяць на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Аднак размова ідзе пра сацыяльнае жыллё.

Яўген Баешка сказаў, што на такім уліку ён не знаходзіцца. Наталля Качанава выказала занепакоенасць тым, што людзі не ведаюць аб сваіх правах, а таму не становяцца на чаргу па паляпшэнні жыллёвых умоў. Старшыня Савета Рэспублікі паведаміла маладому чалавеку, што яму дапамогуць сабраць дакументы, неабходныя для таго, каб стаць на чаргу. Затым Яўгену падбяруць варыянты сацыяльнага жылля. «Паспрабуем дапамагчы вам», — заўважыла напрыканцы спікер.

...І так — кожнаму, хто прыйшоў на прыём. А людзей, паверце, было нямала. Грамадзяне давяраюць парламентарыям: яны ведаюць, што іх не толькі выслухаюць, але і дапамогуць знайсці шляхі вырашэння той ці іншай праблемы. У Савеце Рэспублікі дзверы адчыняюцца нават для тых, для каго яны ўжо неаднойчы зачыняліся ў іншых месцах.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

# Ад медабслугоўвання да рыбалкі

## З чым звярталіся людзі на прамую тэлефонную лінію да старшыні Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзіміра Цярэнцьева



Фота «Віцебскія весткі».

**«Прамая лінія — гэта эфектыўны інструмент непасрэднага ўзаемадзеяння з насельніцтвам на адлегласці. Многія людзі з раёнаў нашай вобласці з розных прычын не могуць наведаць прыём грамадзян, таму такая форма работы будзе актуальная заўсёды, хоць званкоў з кожным разам паступае ўсё менш. Гэта з'яўляецца паказчыкам таго, што пытанні, якія ўзнікаюць, мы стараемся вырашаць аператыўна», — падкрэсліў кіраўнік дэпутацкага корпуса паўночнага рэгіёна.**

На здзіўленне, з васьмі званкоў не было ні адной прэтэнзіі да работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, якая звычайна лідзіруе ў рэйтынгу праблемных пытанняў. Жыхар аграгарадка Копысь Аршанскага раёна адзначыў, што прадстаўнікі аблвыканкама недастаткова часта праводзяць прыёмы грамадзян у Оршы, каб усе жадаючыя маглі звярнуцца. Мужчына і сам з-за недастатковага інфармавання праз сродкі масавай інфармацыі не трапіў у студзені на прыём да намесніка старшыні аблвыканкама. «Варта падкрэсліць, што Орша знаходзіцца ў цэнтры ўвагі не толькі кіраўніцтва Віцебшчыны, але і розных службаў і арганізацый, якія рэгулярна прымаюць прапановы па ўдасканаленні ўзроўню жыцця ў раёне», — адзначыў Уладзімір Цярэнцьеў і запэўніў, што ў красавіку ў рамках Адзінага дня інфармавання асабіста наведае Копысь разам з кіраўнікамі ўпраўленняў вобласці.

У жыхароў Чашніцкага раёна саспела калектыўнае «рыбнае» пытанне. Возера Лукомльскае, якое з'яўляецца месцам прыцягнення не толькі мясцовых аматараў «мокрага палявання», але і рыбакоў з Мінска і нават Расіі, больш за пяць гадоў таму было ўзята ў арэнду. Як вынік — арандатары ўвялі платную рыбалку, што стварыла сярод мясцовых жыхароў — і не толькі — грамадскі рэзананс. Ні для каго не сакрэт, што амаль усе азёры цяпер знаходзяцца ў арэндзе — гэта правільна, у кожнага воднага аб'екта павінен быць свой гаспадар, які будзе сачыць і за арганізацыяй парадку ў прыбярэжнай зоне, і за рыбнай разнастайнасцю, якая каштуе вялікіх грошай. Напрыклад, Лукомльскае зарыбілі сцерляддзю, таўсталобікам, карпам і шчупаком. Свядомасць мясцовых жыхароў, для якіх рыбалка заўсёды была спосабам заробку і адпачынку, не змагла пераключыцца так хутка на тое, што трэба плаціць. Арандатарам паступалі пагрозы ад рыбакоў, калектыўныя скаргі накіроўваліся ў мясцовыя органы ўлады, і быццам бы пытанне было вырашана — для мясцовых жыхароў дзейнічалі льготныя абанементы. Аднак цяпер па Новалукомлі пракацілася другая хваля незадаволенасці — разавае наведванне возера з мэтай парыбачыць каштуе 2,50 рубля. Сума невялікая, аднак для пенсіянераў, якія прывыклі практычна штодня адпачываць з вудай, — даволі істотная. Старшыня абласнога Савета дэпутатаў паабяцаў жыхарам Чашніцкага раёна паспрыяць у вырашэнні дадзенага пытання.

Адразу два званкі, якія паступілі на прамую лінію, датычыліся аховы здароўя, прычым пытанні ўскосна перасякаліся, закранаючы не столькі недахопы ў рабоце медыкаў, колькі стаўленне грамадзян да ўзніклых праблем. Так, жыхарка Віцебска наракала, што паліклініку, якая знаходзіцца блізка ад яе дома, пераносяць. Раней пажылым грамадзянам было вельмі зручна ў крокавай даступнасці наведваць масаж, неабходныя стацыянарныя працэдуры, а цяпер да ўрачоў прыйдзецца ехаць некалькі прыпынкаў.

Справа ў тым, што цяперашні будынак, у якім размяшчаецца паліклініка, патрабуе капітальнага рамонту, і габарыты памяшканняў перавышаюць існуючы там медыцынскі персанал — адным словам, тэрыторыі аб'екта аховы здароўя больш, чым патрабуецца. У сувязі з гэтым і было вырашана перанесці паліклініку ў новае камфартабельнае памяшканне, якое знаходзіцца ад месца пражывання жанчыны за некалькі прыпынкаў, а не на іншым канцы горада.

З падобным пытаннем звярнулася і жыхарка Рубы (пасёлак, які знаходзіцца ў мяжы Віцебска): яна папрасіла паспрыяць у накіраванні ў шостую паліклініку ўрача-рэўматолага, таму што пакуль жыхары Рубы вымушаныя ездзіць па ўсім горадзе ў пошуках спецыяліста, а рабіць тое з болем у нагах вельмі цяжка. Прычым жыхары просяць накіраваць доктара ў віцебскую паліклініку не на шэсць дзён у тыдзень, а каб ён мог прымаць пацыентаў хоць бы два-тры дні, яны гатовыя пры неабходнасці ездзіць на прыём за 17 кіламетраў. «Вядома, ўрача мы накіруем неадкладна. Важна, каб у кожнай установе аховы здароўя аказвалася неабходная насельніцтву дапамога», — адзначыў Уладзімір Уладзіміравіч.

Жыхары Баронікаў папрасілі дапамогі ў вырашэнні праблемы бадзяжных сабак, якія тэрарызуюць мінакоў каля газанапаўняльнай станцыі. Грамадзяне звярталіся і ў міліцыю, і ў мясцовыя органы ўлады, — адказу няма. Сабак падкормліваюць і трымаюць у якасці аховы на гэтай самай станцыі, але без прывязі, што істотна ўскладняе шлях на прыпынак, які размешчаны побач.

Жыхарка Мёрскага раёна прасіла аказаць садзейнічанне ва ўстаноўцы электракатла, а жанчына з Віцебска звярнулася з традыцыйным ужо на працягу 20 гадоў пытаннем: што рабіць з чэкамі жылля, якія захаваліся да гэтага часу. «Калісьці быў бум на звароты з нагоды чэкаў, некалькі разоў падаўжалі тэрмін іх выкарыстання, але да гэтага часу ўзнікаюць падобныя пытанні. Чэкі сёння страцілі сваю каштоўнасць, у кожнай праблемы ёсць свой тэрмін вырашэння», — распавёў кіраўнік дэпутацкага корпуса.

Пенсіянер з Віцебска звярнуўся на прамую лінію з пытаннем аб выхаванні падрастаючага пакалення, а канкрэтна — чаму моладзь не саступае ў транспарце месца пажылым. З такім пытаннем мужчына ўжо звяртаўся ў Савет дэпутатаў, на яго адрэагавалі неадкладна — у грамадскім транспарце рэгулярна транслююцца галасавыя паведамленні аб неабходнасці саступаць месцы інвалідам, пажылым людзям, пасажырам з дзецьмі і цяжарным жанчынам. Аднак, на думку мужчыны, такая форма работы з моладдзю належнага эфекту не прыносіць, і варта было б стварыць рэйды, якія маглі б правяраць у транспарце, ці прыслухоўваюцца да гэтага маладыя людзі.

Падчас трохгадзіннай тэлефоннай лініі гучалі словы падзякі за аказаную раней дапамогу на адрас старшыні, службаў і арганізацый, мясцовых органаў кіравання.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

# Пад эгідай «Цягніка Памяці»

## Сенатары ўзялі ўдзел у адборачным туры беларуска-расійскага патрыятычнага праекта

**У Гродзенскай вобласці вызначаны дзесяцікласнікі, якія адправяцца ў падарожжа па знакавых мясцінах Беларусі і Расіі ў рамках культурна-адукацыйнага праекта «Цягнік Памяці-23». Падчас дыялогавай пляцоўкі прэтэндэнты мелі магчымасць задаць пытанні парламентарыям і прадстаўнікам мясцовых органаў улады.**

Сёлета патрыятычны цягнік збярэ сваіх юных пасажыраў другі раз. Трэба сказаць, што першае падарожжа выклікала даволі вялікі ажыятаж у маладзёжным асяроддзі. Мабыць, няма такога дзесяцікласніка, які б не марыў адправіцца ў гэту незвычайную і цікавую паездку. Дарэчы, чаму менавіта толькі згаданая катэгорыя школьнікаў абрана для ўдзелу ў праекце? Падчас дыялогавай пляцоўкі **начальнік галоўнага ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама Руслан АБРАМЧЫК** растлумачыў, што ў дзесяцікласнікаў яшчэ няма такой вучэбнай нагрузкі, як, напрыклад, у выпускнікоў, якім трэба здаваць экзамены. Да таго ж была абавязковая ўмова, каб удзельнікі былі не малодшыя за 14 гадоў: гэты ўзрост прадугледжвае пэўную самастойнасць і прававую адказнасць.

Увогуле жадаючых было вельмі шмат, паведаміў кіраўнік абласной адукацыі. З шасці тысяч дзесяцікласнікаў Гродзеншчыны ў адборы ўдзельнічала ажно 800 чалавек. Прытым, што з вобласці паедзе толькі восем вучняў, можна ўявіць, што гэта за конкурс. Канчатковых прэтэндэнтаў урэшце было вылучана амаль 50 чалавек. Гэта дзесяцікласнікі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, якія паспяхова вучацца, добра паказалі сябе ў грамадскай, спартыўнай, валанцёрскай дзейнасці, з'яўляюцца лідарамі вучнёўскага самакіравання, актывісты грамадскіх арганізацый, вучні ваенна-патрыятычных і кадэцкіх класаў, члены Маладзёжнага парламента.



Фота БелТА.

Як выбраць з іх толькі восем? Вядома, праз конкурс. Для таго каб вызначыць найлепшых, была падрыхтавана пэўная конкурсная праграма — як пазнавальная, так і творчая. У яе рамках кожны ўдзельнік расказвае пра сябе, паказвае свае веды аб гісторыі дзяржавы і падзеях Вялікай Айчыннай вайны, бо менавіта дадзенай тэме прысвечаны праект «Цягнік Памяці». Акрамя таго, канкурсанты дэманструюць свае творчыя здольнасці — яны будуць дарэчы ў ходзе паездкі. Абавязкова ўлічваецца той багаж дасягненняў, які набыты вучнем за 10 гадоў вучобы.

**Член Савета Рэспублікі, удзельнік «Цягніка Памяці-2022» Віктар ЛІСКОВІЧ** адзначыў, што такі высокі конкурс невыпадковы, ён сведчыць аб унікальнасці і папулярнасці праекта. Сенатар нагадаў, што беларуска-расійскі праект праходзіць пад патранатам Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Наталлі Качанавай і Старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі Валянціны Матвіенкі. Праект паспяхова стартаваў летась і выклікаў вялікую зацікаўленасць у абедзвюх краінах. За два тыдні 200 яго ўдзельнікаў праехалі больш за 6 тысяч кіламетраў, наведалі 15 гарадоў са славутай ваеннай гісторыяй.

За незвычайным падарожжам актыўна назіралі тысячы маладых людзей з Беларусі і Расіі. Сёлета ў праграму будуць унесены некаторыя змяненні. Яны датычацца як складу ўдзельнікаў, так і маршруту цягніка. Мяркуецца, што сёлета да беларуска-расійскага праекта далучацца па 12 прадстаўнікоў Арменіі, Кыргызстана і Казахстана, з Беларусі — 55 чалавек. Такім чынам, у праекце будзе ўдзельнічаць пяць краін. Віктар Лісковіч выказаў меркаванне аб далейшым пашырэнні спісу ўдзельнікаў праекта з ліку былых рэспублік Савецкага Саюза. Такія планы стаяць да 2025 года.

Таксама вырасце колькасць прыпынкаў цягніка. Адным з ключавых момантаў стане наведванне мемарыяльнага комплексу «Хатынь». У маршруце — Полацк, Уфа, Ніжні Ноўгарад, Курск, Валгаград, Мінск, Масква і іншыя знакавыя гарады. Але месца старту цягніка застанецца нязменным. Як і летась, ён будзе дадзены з Брэсцкай крэпасці 22 чэрвеня.

Таксама Віктар Лісковіч падкрэсліў, што сёлета на сустрэчах з удзельнікамі праекта будзе задзейнічана вялікая колькасць моладзі, плануюцца анлайн-трансляцыі з месцаў падзей, шырокая інфармацыйная падтрымка.

Што датычыцца адзення ўдзельнікаў праекта, яна застанецца такой самай, як летась, з тым жа лагатыпам. Кожны атрымае камплект па сваіх памерах. Дарэчы, форма для ўдзельнікаў з усіх пяці краін будзе пашытая беларускім бокам.

Важнасць патрыятычнага кірунку праекта адзначыў падчас дыялогавай пляцоўкі **член Савета Рэспублікі, дырэктар Гродзенскага абласнога драмтэатра Ігар ГЕДЗІЧ.** Ён лічыць, што такі акцэнт сёння як ніколі актуальны, асабліва ў маладзёжным асяроддзі. У яго ёсць свой наказ удзельнікам «Цягніка Памяці»:

—Трэба ведаць сваю гісторыю, ганарыцца сваёй зямлёй, таму што ў жыцці бываюць сітуацыі, калі прыходзіцца адстойваць сваю радзіму. Асабліва ў тых выпадках, калі краіну імкнуцца прынізіць. Трэба ўмець адказаць на такія выпады. Напрыклад, добра ўсведамляць, што пры вызваленні Польшчы загінула каля 600 тысяч савецкіх воінаў, і ў той жа час нашу краіну не запрашаюць на памятныя мерапрыемствы, у Еўропе зносяць помнікі салдатам-вызваліцелям. Па ўсіх падобных момантах павінна быць адпаведная рэакцыя, мы павінны адстойваць сваю краіну.

Прэтэндэнты і самі добра разумеюць адказнасць місіі. Яны бачаць перад сабой прыклад папярэдняга складу ўдзельнікаў «Цягніка Памяці». Пасля паездкі ва ўсёй сістэме адукацыі з восені мінулага года прайшоў шэраг мерапрыемстваў, у тым ліку ў рамках праекта «Школа актыўнага грамадзяніна». Удзельнікі «Цягніка Памяці» разам з педагогамі наведалі вучнёўскія калектывы, расказалі аб сваім вопыце ўдзелу ў праекце. Гэта не магло не зацікавіць слухачоў. Таксама ва ўсіх установах адукацыі былі арганізаваны тэматычныя выстаўкі з самымі яскравымі момантамі падарожжа.

— Удзельнікі «Цягніка Памяці» будуць і надалей запатрабаванымі, — упэўнены сенатар Віктар Лісковіч. — Думаю, праз некалькі гадоў мы пачнём ладзіць злёты на абласным узроўні, а потым, магчыма, і на ўзроўні краіны. Відавочна, што фарміруецца новы рух маладых людзей пад эгідай «Цягніка Памяці».

А ў Маладзёжным парламенце Гродзеншчыны ўжо ёсць ідэя зладзіць абласны агітбус з удзельнікамі патрыятычнага цягніка, каб папулярызаваць дадзены рух ва ўсіх раёнах вобласці.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

# ЧАВУСКІЯ РЭКОРДЫ

## Абласныя лыжныя гонкі «Магілёўская лыжня — 2023» парадавалі азартам, эмоцыямі, смачнай кашай і гарбатай

**Чавусы вядомыя ў краіне як цэнтр развіцця біятлона, тут функцыянуе адна з моцных дзіцяча-юнацкіх школ па гэтым відзе спорту. Адсюль выйшлі вядомыя на ўвесь свет сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў у Ванкуверы Сяргей Новікаў, алімпійская чэмпіёнка Дзінара Алімбекава. Некалькі гадоў таму спартыўную базу школы істотна ўмацавалі, цяпер тут свайго роду міні-Раўбічы, дзе праводзяцца гульні не толькі раённага маштабу. Гэтым разам цэнтрам увагі стала лыжаролерная траса, дзе рэкорды ставілі прадстаўнікі выканаўчай улады, дэпутаты, праваахоўнікі, ратавальнікі і ўсе ахвотныя. Эстафетныя забегі рабіліся на 1000 метраў, была магчымасць паўдзельнічаць і ў індывідуальных гонках.**




Фота з сайта mogilevnews.by

Непасрэдны ўдзел у абласных лыжных спаборніцтвах прынялі 27 камандаў — каля 500 чалавек з усёй вобласці, а з улікам балельшчыкаў, па некаторых падліках, наогул каля тысячы.

Ганаровымі гасцямі вялікага спартыўнага свята сталі старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Ісачанка, старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Ірына Раінчык, намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Малашка, начальнік упраўлення спорту і турызму Магілёўскага аблвыканкама Сяргей Новікаў.

— Падобныя мерапрыемствы трэба праводзіць, — аргументаваў у сваёй прамове Анатоль Ісачанка. — Яны дапамагаюць папулярызаваць здаровы спосаб жыцця. Спорт адыгрывае вялікае значэнне ў жыцці нашай краіны. Яму ўдзяляецца значная ўвага з боку дзяржавы.

Першымі на старт выйшлі каманды раёнаў з удзелам іх кіраўнікоў або намеснікаў. Каманды спаборнічалі ў змешанай эстафеце, было відаць, з якім азартам і натхненнем яны змагаліся за перамогу. Гэтым разам не было роўных лыжнікам Круглянскага раёна, яны і сталі лідарамі. На другім месцы — прадстаўнікі Глускага раёна, на трэцім — Быхаўскага.



У другім забегу прынялі ўдзел каманды структурных падраздзяленняў Магілёўскага аблвыканкама. Перамагла каманда апарату аблвыканкама, на другім месцы — прадстаўнікі камітэта па архітэктуры і будаўніцтве, трэцяй фінішавала каманда галоўнага ўпраўлення па адукацыі.

У спаборніцтвах сярод прадстаўнікоў сілавых структур найлепшы вынік — у каманды ўпраўлення УУС Магілёўскага аблвыканкама. На другім і трэцім месцах — прадстаўнікі КДБ па Магілёўскай вобласці і абласнога ўпраўлення МНС.

Не менш відовішчнымі былі масавыя гонкі сярод аматараў, у якіх бралі ўдзел прадстаўнікі ад 18 і да 70 гадоў.

**Старшыня Круглянскага раённага Савета дэпутатаў Сяргей ХРАМЦОЎ** на працягу 20 гадоў нязменны ўдзельнік лыжных спаборніцтваў — і раённых, і абласных.

— Гэта адзін з маіх любімых відаў спорту з часоў вучобы на факультэце фізвыхавання Магілёўскага тады яшчэ педінстытута, — адзначыў ён. — З тых часоў падтрымліваю форму. Наогул, люблю зіму за магчымасць пакатацца на лыжах. І вельмі радуюся, убачыўшы на лыжні дзяцей. Калі бацькі прывучаць іх катацца на лыжах, то зробяць самы вялікі ўнёсак у здароўе. На раённым лыжным свяце мы ўсіх дзетак заахвочвалі медалькамі і шакаладкамі. Лыжамі наогул нельга не захапіцца. І гэтыя дзеці потым перададуць сваё захапленне сваім дзецям, традыцыя працягнецца, лыжнае свята будзе існаваць і надалей. Яно вельмі яскравае, атмасфернае, а галоўнае — вельмі карыснае для здароўя. Падыхаць свежым паветрам, прамчацца з ветрыкам на лыжах, палюбавацца прыродай і адчуць сябе яе часцінкай — што можа быць лепш?

У раёне паклапаціліся, каб свята было не толькі відовішчным, але і хлебасольным. Валанцёры Чырвонага Крыжа частавалі гарачай гарбатай. Гандлёвыя аб'екты прапанoўвалі розныя прысмакі. Не абышлося без смачнай кашы, якой можна было падсілкавацца бясплатна.

— Спорт не толькі гуртуе калектыў, але і нацэльвае яго ў рабоце на камандны вынік, — перакананы **старшыня Чавускага райсавета дэпутатаў, старшыня Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў Анатоль МАЦЮЛІН.** — «Магілёўская лыжня — 2023» чарговы раз даказала гэта, падарыла ўдзельнікам незабыўныя эмоцыі і выдатны настрой. А для навучэнцаў нашай Чавускай абласной сярэдняй школы, дзе выхоўваюцца будучыя біятланісты і якім, па сутнасці, належыць гэтая база, было вельмі прыемна ўбачыць, якая вялікая ўвага ўдзяляецца абранаму імі віду спорту. Гэта стала яшчэ адным моцным стымулам.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ТУРНІР У ПАМЯЦЬ ПРА ЗЕМЛЯКА

## Штогадовыя спаборніцтвы па валейболе ў Павіцці становяцца святам спорту і здаровага спосабу жыцця

**Ужо не першае дзесяцігоддзе ў аграгарадку Павіцце Кобрынскага раёна праходзіць турнір па валейболе. Арганізатарам мерапрыемства выступае Павіццеўскі сельскі Савет. Яго старшыня Раіса ДЗЯЦУК расказала карэспандэнту «МС», што турнір цяпер праводзіцца ў памяць пра яго заснавальніка, настаўніка фізкультуры Уладзіміра Брышцена.**



Уладзімір Васілевіч быў не проста вясковым настаўнікам — ён быў вельмі паважаным, аўтарытэтным чалавекам. Заўчасна пайшоў з жыцця, але пасля сябе пакінуў вучняў, паслядоўнікаў і галоўнае — традыцыі любові да фізкультуры і спорту. Калега і сябар Уладзіміра Брышцена Мікалай Чопік, які на гэты раз выступіў суддзёй спаборніцтваў, падчас адкрыцця мерапрыемства добрым словам згадаў Уладзіміра Васілевіча:

— Мы былі не проста калегамі, а сябрамі з дзяцінства, хадзілі ў адну школу. Любоў да заняткаў фізкультурай некалі прывіў нам школьны настаўнік. Тады ў Павіцці на кожным роўным лапіку зямлі гулялі ў футбол, хакей, валейбол, стваралiся вулічныя каманды. Ніхто не сядзеў дома... У канцы 1980-х — пачатку 1990-х усё гэта стала паступова згасаць і адрадзілася толькі з прыходам Уладзіміра Брышцена на пасаду калгаснага інструктара па спорце. Потым Уладзімір Васілевіч стаў настаўнікам, і школьная спартыўная зала зрабілася месцам прыцягнення ўсёй моладзі. Дзе яшчэ знойдзецца вёска, у якой ёсць ажно чатыры валейбольныя жаночыя каманды? А ў Павіцці дзяўчаты трэніруюцца вечарамі, ніхто іх не заахвочвае, ніхто не прымушае. Заняткі сталі неад'емнай часткай вясковай культуры.

Сапраўды, да турніру тут рыхтуюцца, нібы да свята. Вось і на гэты раз у Павіцце прыехала шмат гасцей, знайшліся спонсары добрай справы. У ліку апошніх — Кобрынскі хлебазавод, які ўзнагародзіў кожную з удзельніц салодкім сувенірам. У спартыўную залу школы прыйшло шмат балельшчыкаў — родных, сяброў, суседзяў удзельніц камандаў. Спаборніцтвы атрымаліся азартнымі і відовішчнымі.

Першае месца заваявалі спартсменкі ААТ «Дняпроўска-Бугскае», сярэбраным прызёрам стала каманда Павіццеўскай сярэдняй школы, на трэцяй прыступцы аказалася каманда «Павіцяначка». Акрамя дыпломаў, кубкаў, медалёў і заахвочвальных прызоў ад спонсараў, усе атрымалі зарад пазітыву.

Варта сказаць, што Павіцце, дзе пражывае каля 1200 чалавек, утварае сельсавет. Аўтару гэтых радкоў не раз даводзілася бываць у сельсаветах, якія складаюцца з трох, а то і чатырох дзясяткаў вёсак. У Баранавіцкім раёне, напрыклад, ёсць сельсавет, у склад якога ўваходзіць паўсотні населеных пунктаў. А самадастатковасць Павіцця, відаць, абумоўленая яго геаграфічным становішчам. Яно размешчана крыху ўбаку ад іншых вёсак, схавалася за лясамі і балотамі на самым поўдні Кобрынскага раёна, на мяжы з Украінай. Тут з павагай ставяцца да традыцый і звычак продкаў і разам з тым чулыя да ўсяго новага.

Паводле слоў кіраўніка мясцовай улады Раісы Дзяцук, тутэйшыя кабеты, якія спрэс за рулём, у час хуткаснага інтэрнэту не лічаць сябе правінцыялкамі. І іх павальнае захапленне фізкультурай і спортам — таму пацвярджэнне.

Сёння ў мясцовай сярэдняй школе разам з садком навучаецца і выхоўваецца каля 150 дзяцей. Ёсць амбулаторыя, пошта, аддзяленне банка, працуюць чатыры крамы. Не закрывалі і лазню, што цяпер — рэдкасць. Працуюць вяскоўцы ў сельгаспрадпрыемстве, лясніцтве, на тэрыторыі ёсць чатыры фермерскія гаспадаркі, дзейнічаюць індывідуальныя прадпрымальнікі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРНІКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**
**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**
**Тыраж 10.681. Нумар падпісаны ў 19.30 28 лютага 2023 года.**

На слыху

# Фактары рызыкі маюць амаль усе

## Як іх дапамагае выявіць дыспансерызацыя?

**З бягучага года ўведзены новы парадак правядзення дыспансерызацыі. Чым ён адрозніваецца ад ранейшага? Што дапамагае выявіць? Колькі часу на практыцы займае дыспансерызацыя і якія абследаванні ўключае? Якія анкалагічныя захворванні можна выявіць падчас дыспансерызацыі? Пра гэта і іншае расказала галоўны ўрач 32-й гарадской клінічнай паліклінікі Мінска Ірына СВОРАБ.**

— Новы парадак правядзення дыспансерызацыі накіраваны ў першую чаргу на выяўленне фактараў рызыкі неінфекцыйных хвароб. Калі раней мы праводзілі дыспансерызацыю, каб дыягнаставаць саму хваробу, то цяпер выяўляем прадвеснікі захворванняў, якіх яшчэ няма, — тлумачыць Ірына Вадзімаўна. — Робіцца гэта для таго, каб не развілося захворванне. Асноўнае, з чаго пачынаецца дыспансерызацыя, — анкетаванне. Па яго выніках мы выяўляем фактары рызыкі неінфекцыйных хвароб.

***— Якіх канкрэтна?***

— Чатырох асноўных груп захворванняў: сардэчна-сасудзістай сістэмы, анкалагічных, цукровага дыябету і хранічнай абструкцыйнай хваробы лёгкіх. У залежнасці ад выяўленых падчас анкетавання фактараў рызыкі фарміруецца аб'ём далейшых абследаванняў.

Важна дадаць, што, акрамя анкетавання, усім пацыентам вымяраюць рост, вага, вызначаецца індэкс масы цела, вымяраецца акружнасць таліі, аглядаецца поласць рота для ранняй дыягностыкі передпухлінных утварэнняў. Пацыентам старэйшым за 40 гадоў, праводзіцца вымярэнне ўнутрывочнага ціску.

***— Якія дадатковыя абследаванні могуць прызначацца?***

— Агульны аналіз крыві і мачы, кроў на глюкозу, электракардыяграма. Гэтыя аналізы праводзяцца ў паліклініцы ў дзень дыспансерызацыі. Калі пацыент не нашча будзем рэкамендаваць, каб прыйшоў у зручны для яго час, калі ён будзе гатовы.



Таксама ў аб'ём дыспансерызацыі ўваходзіць флюараграфічнае абследаванне, якое праводзіцца штогод для кантынгентаў з пагрозамі, і адзін раз на тры гады — для ўсіх астатніх. Жанчынам трэба наведаць аглядавы кабінет ці гінеколага.

Акрамя таго, пацыентам пэўных груп і ўзростаў праводзяцца такія абследаванні, як мамаграфія (для жанчын 50—69 гадоў), даследаванне прастатспецыфічнага антыгена для выяўлення раку прастаты (у мужчын 45—65 гадоў) і аналіз калу на скрытую кроў (для жанчын і мужчын ва ўзросце ад 50 да 60 гадоў). Усе гэтыя абследаванні накіраваны на ранняе выяўленне анкалагічных хвароб.

***— Што рабіць з выяўленымі фактарамі рызыкі, калі ты пра іх даведаўся?***

— Па выніках дыспансерызацыі пацыенту даюцца рэкамендацыі па іх карэкцыі. Яны датычацца харчавання, спосабу жыцця, адмовы ад пэўных шкодных звычак, фізічнай актыўнасці. Калі ў пацыента выявілі фактары рызыкі, яго запісваюць да ўрача агульнай практыкі ў зручны час. Далей ідзе медыцынскае назіранне. Пры неабходнасці ўрач прызначыць дадатковыя абследаванні.

***— У пацыента ўжо можа быць захворванне, напрыклад, артэрыяльная гіпертэнзія, ён пра яго ведае і п'е таблеткі. Яму патрэбная дыспансерызацыя?***

— Вядома, бо мы можам выявіць рызыку развіцця анкалагічнага захворвання або цукровага дыябету.

***— Як трапіць на дыспансерызацыю? Раскажыце на прыкладзе вашай паліклінікі.***

— У нас арганізавана работа трох кабінетаў. Два з іх прымаюць па запісе, яшчэ адзін адкрыты ў аддзяленні прафілактыкі для пацыентаў, якія прыйшлі без запісу ў даўрачэбны кабінет па выпіску з медыцынскіх дакументаў, для правядзення прафілактычных медыцынскіх аглядаў.

Запісацца пацыент можа як па тэлефоне, так і пры асабістым звароце ў стол даведак або на сайце паліклінікі. Акрамя таго, яго могуць накіраваць і з прыёму ўрача. У нас маецца дзве групы дыспансернага назірання: ад 18 да 39 гадоў, якія праходзяць дыспансерызацыю адзін раз на тры гады, і ад 40 гадоў і старэйшыя, якія праходзяць яе штогод. У адпаведнасці з гэтым мы стварылі планы дыспансерызацыі. У групе, якая праходзіць яе раз на тры гады, узялі толькі трэць і размеркавалі па месяцах. У адпаведнасці з планамі мы адсочваем працэнт выканання. Медыцынскія сёстры запрашаюць на дыспансерызацыю пацыентаў са свайго ўчастка. Пакуль мы ідзём у адпаведнасці з графікамі: абследавана каля 14-15 % пацыентаў.

Вольны час для запісу на дыспансерызацыю ёсць на ўсе дні, гэтая працэдура цалкам даступная.

***— А колькі займае дыспансерызацыя?***

— Анкетаванне і агляд — каля 15 хвілін. На працягу дня можна прайсці дадатковыя абследаванні. У рамках дыспансерызацыі работа лабараторыі арганізавана на цэлы дзень, як і работа флюараграфічнага кабінета і кабінета функцыянальнай дыягностыкі, дзе робіцца электракардыяграма. Ёсць магчымасць зрабіць яе і ў кабінеце дыспансерызацыі. Усё рэальна прайсці за адзін дзень.

Калі ў пацыента фактараў рызыкі не выяўлена, то ўсё завяршаецца на анкетаванні і аглядзе. Пацыент атрымлівае рэкамендацыі па здаровым спосабе жыцця, і абследаванне завершана. Праўда, трэба сказаць, што фактары рызыкі мае большасць пацыентаў. З чатырох тысяч праанкетаваных намі на пэўным этапе толькі ў 129 чалавек не выяўлена фактараў рызыкі.

***— Як працуюць кабінеты дыспансерызацыі?***

— З 8 да 20 гадзін на працягу ўсяго рабочага дня. Іх прапускная здольнасць — да 90 чалавек. Акрамя кабінетаў дыспансерызацыі, з улікам не вельмі адказных адносін пацыентаў да свайго здароўя і адсутнасці жадання прайсці дыспансерызацыю, яе праводзяць і ўрачы агульнай практыкі, і іншыя спецыялісты, да якіх звярнуўся пацыент са сваёй нагоды. У іх ёсць магчымасць падключэння да Нацыянальнага партала электронных паслуг, дзе праводзіцца анкетаванне. Адпаведна, усе абследаванні, якія робяцца ў рамках дыспансерызацыі, могуць быць праведзены ў іншых кабінетах.

Скажыце, доктар...

# КАШАЛЬ У ДЗЯЦЕЙ: ЛЯЧЫЦЬ ЦІ НЕ?

**Кашаль у дзяцей — справа тонкая, скажа любы дасведчаны доктар. Сапраўды, ніводны іншы сімптом хваробы не мае столькі нюансаў. Сухі і вільготны, глухі і звонкі, моцны і слабы — можна пералічваць велізарную колькасць адценняў. Таму перш чым пачынаць лячыць кашаль, трэба зразумець яго прычыну. Разбіраемся, што варта абавязкова зрабіць, перш чым звяртацца па лекі, і што трэба ведаць аб прэпаратах перад тым, як ісці ў аптэку.**

### ЛІКВІДУЕМ ПРЫЧЫНУ

«Лекі ад кашлю» для ўрача гучыць гэтак жа недарэчна, як «лекі ад галавы» ці, напрыклад, «ад паносу». Ніводны доктар не можа прызначыць іх, не ўбачыўшы хворага і не ўяўляючы, аб якім кашлі і пра якую хваробу ідзе гаворка.

— Лечаць не кашаль, а хваробу, якая прывяла да яго ўзнікнення. Ёсць нешта, што раздражняе слізістыя абалонкі дыхальных шляхоў і прыводзіць да ўтварэння макроты і ўзнікнення кашлю, — тлумачыць **загадчыца 3-га педыятрычнага аддзялення 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Мінска Людміла КІПЦЭВІЧ.** — Ліквідуем тое «нешта» — кашаль спыніцца. І тут ёсць некалькі варыянтаў. Пры бактэрыяльнай інфекцыі прызначаюцца антыбіётыкі, пры алергіі — супрацьалергічны прэпарат, пры вірусной інфекцыі проста чакаем, пакуль арганізм сам справіцца з вірусам, або прызначаем супрацьвірусныя прэпараты.

Такім чынам, трэба разумець, што кашаль не пройдзе, пакуль не будзе ліквідавана яго прычына. Калі вы ці ваша дзіця кашляеце таму, што ў пакоі вельмі суха, вы будзеце кашляць да той пары, пакуль не купіце ўвільгатняльнік, альбо пакуль не прыйдзе вясна і не адключыцца цэнтральнае ацяпленне.

### ПАВЫШАЕМ ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

У той жа час кашаль істотна пагаршае жыццё хворага дзіцяці і яго сваякоў. Таму проста цярпліва чакаць, пакуль кашаль пройдзе, не варта.



— Кашаль пры ВРЗ — не проста сімптом, які перашкаджае жыць, гэта ключавы механізм актыўнай ачысткі дыхальных шляхоў. Таму галоўны прынцып сімптаматычнага лячэння кашлю — не ліквідаваць яго, а павышаць эфектыўнасць, — кажа ўрач. — Найважнейшая асаблівасць эфектыўнага кашлю — выдаленне назапашанай макроты.

**Што вызначае эфектыўнасць кашлю?**

- Здольнасць кашляць, гэта значыць сіла кашлевага штуршку і магчымасць кашляць свядома. Чым большае дзіця, тым мацнейшыя дыхальныя мышцы і кашлевы штуршок, тым большы аб'ём паветра, што выдыхаецца. У немаўлят з адкашліваннем больш праблем.
- Якасць макроты. Калі яна вадкая, адкашлваецца лёгка, а кашаль эфектыўны. Густая — адкашлваецца вельмі цяжка.

Таму часта надзвычай важна ўплываць на якасць макроты, каб яна стала больш вадкай, лягчэй адыходзіла. І тут важна падтрымліваць рэжым прахаладнага вільготнага паветра, што з'яўляецца прафілактыкай перасыхання макроты і слізістых. Неабходна таксама шмат піць для забеспячэння нармальнай рэалогіі крыві.

— Калі дзіця цёпла адзетае, шмат п'е, у пакоі халаднавата і вільготна, гэта азначае, што амаль 90 % мерапрыемстваў, накіраваных на сімптаматычнае лячэнне кашлю, вы ўжо ажыццявілі, — звяртае ўвагу ўрач.

### ЦІ ПАТРЭБНЫЯ ТАБЛЕТКІ?

Існуюць дзве асноўныя групы лекавых сродкаў. Першая група — супрацькашлевыя сродкі, якія яго прыбіраюць. Другая — адхарквальныя лекі, якія паляпшаюць кашаль.

Першая група прызначаецца ў сітуацыях, калі кашаль не карысны, не мае фізіялагічнай мэтазгоднасці, не спрые выздараўленню, а толькі перашкаджае. Такіх выпадкаў няшмат. Самае відавочнае паказанне — коклюш. Акрамя таго, запаленне вонкавай абалонкі лёгкіх — плеўры. Таксама прэпараты першай групы прызначаюцца пры некаторых надзвычай небяспечных лёгачных хваробах, як правіла, анкалагічных, і пры падрыхтоўцы да правядзення хірургічных або отапарынгалагічных маніпуляцый, калі інструмент уводзіцца ў дыхальныя шляхі.

Адхарквальныя сродкі прызначаюцца, калі трэба вывесці макроту з дыхальных шляхоў.

Асартымент адхарквальных сродкаў, якія ёсць у аптэчнай сетцы і рэальна выкарыстоўваюцца ў дзіцячым узросце, велізарны — некалькі сотняў прэпаратаў у самых разнастайных лекавых формах.

— Паказанні да ўжывання, выбар канкрэтнага прэпарату, працягласць выкарыстання, доза — усё гэта вельмі індывідуальна, вызначаецца дыягназам, цяжарам захворвання, узростам пацыента і самае галоўнае — урачом, — рэзюмуе Людміла Кіпцэвіч.

# ХЛЕБ І МОВА










**Жыхарка Ушачаў Людміла ДУНЕЦ не першы год у хатніх умовах займаецца выпечкай хлеба па старажытных рэцэптах. Абуджаная памяць пра маленства, праведзенае ў бабулінай хаце з водарам свежага хлеба, натхніла былога віцебскага філолага вярнуцца на сваю малую радзіму і ўзнавіць бабулін занятак. Жанчына не толькі асвойвае новыя гатункі хлебных вырабаў, але і далучае дачку Любаву да сакральнага рамяства.**

Людміла Дунец упэўнена: выпечка хлеба — найцікавейшы занятак для душы, сапраўдная творчасць. Да гэтай справы нельга падыходзіць без крэатыву і адпаведнага настрою. Не трэба быць профі-пекарам альбо дыпламаваным тэхнолагам, а проста любіць гэты занятак, як любілі яго вясковыя жанчыны. Вядома, неабходна ведаць традыцыі, удасканальвацца, шукаць сваю індывідуальную «разыначку». А калі знайсці і высакародную ідэю, тады хлеб будзе атрымлівацца сапраўдным боскім ласункам! Людміла адшукала «фішку» і сваю справу абазначыла адпаведным слоганам: «Традыцыя. Паэзія. Зямля». Ідэя Людмілы простая і арыгінальная адначасова: праз адраджэнне народнай традыцыі хлебапячэння яна нясе веды пра свайго земляка Рыгора Барадуліна і яго паэзію. Менавіта з барадулінскага верша запазычыла радок для назвы брэнда — «Жыта жыцця». У кожны пакет з хлебам гаспадыня кладзе надрукаваны на паперцы верш народнага паэта Беларусі, што вельмі падабаецца пакупнікам.

З хлебам Людміла шчыруе ў вольны час, у асноўны працуе ў Доме культуры. У будучым хоча паставіць сваё хлебнае хобі на прафесійны падмурак, не баіцца канкурэнцыі з боку мясцовага хлебазавода, не турбуе яе і вялікая колькасць прадукцыі на прылаўках крам і супермаркетаў. Разумее, што ў наш час ручны працэс выпечкі запатрабаваны: пакупнік шукае здаровы і карысны прадукт. А калі дадаць да гэтага працэсу і духоўны складнік, хлеб займее сапраўдную гаючую сілу. Людміла кажа: «Ушаччына — пацалаваная Богам зямля, быццам бы сам Гасподзь узяў у жменю гэты паэтычны дар і рассыпаў... Таму тут нарадзіліся такія волаты беларускай паэзіі і літаратуры, як Еўдакія Лось, Пятрусь Броўка, Рыгор Барадулін і Васіль Быкаў. Я люблю іх творы і хачу, каб мае землякі таксама ведалі, любілі і ганарыліся. Родная мова і паэзія — хлеб душы».

А што да тэхналогіі вырабу хлеба, у Людмілы Дунец выпечка заснавана на заквасцы, якую ў свой час сама «вывела і ўзгадавала». Яна пячэ трыццаць розных гатункаў хлябоў. Землякі любяць яе бозханы і батоны з кменам, з ільняным насеннем і семкамі сланечніку, жытне-пшанічныя «кірпічыкі» з яблычным пюрэ, хлеб з ільняной мукой і цёмным соладам, пшанічны сырны — асартыментная лінейка майстрыхі «зашкальвае» і сапраўды ўражвае.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**





## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Форма универсальная для фунд. блоков ФБС 24.4.6, 10 шт.; дополнительные элементы для ФБС 24.3.6 | 11520,00 | 1152,00 | 576,00 |
| 2 | Бункер БП-1.6, инв. № 460; Бункер БП-1.6 СМБ-0.46, инв. № 1062; бадья для бетона БП-1.6, инв. № 254; бункер БН-1,0 Л, инв. № 2417 | 960,00 | 96,00 | 48,00 |
| 3 | Подмости, инв. № 1273; подмости шарнирные, инв. № 1444; подмости шарнирные, инв. № 1447; подмости шарнирные, инв. № 1699; подмости шарнирные, инв. № 1445; подмости шарнирные, инв. № 1448; подмости шарнирные, инв. № 970; подмости шарнирные, инв. № 971; подмости инвентарные шарнирно-панельные ПШ-000А с настил, инв. № 1247; подмости инвентарные шарнирно-панельные ПШ-000 М2 (с настилом), инв. № 2392; подмости инвентарные шарнирно-панельные ПШ-000 М2 (с настилом), инв. № 2393; подмости инвентарные шарнирно-панельные ПШ-000 М2 (с настилом), инв. № 2394; подмости шарнирные, инв. № 967; подмости, инв. № 1272 | 6604,80 | 660,48 | 330,24 |
| 4 | Центробежная насосная установка WEL 6-250 в комплекте Warisco, 1 компл., инв. № 2831; шланг соединительный Varisco, 100 шт.; тройник Varisco, 2 шт.; отвод Varisco, 5 шт.; труба Varisco, 13 шт.; иглофильтр длинный (6 м) Varisco, 40 шт.; иглофильтр средний (4 м) Varisco, 30 шт.; иглофильтр короткий (2,5 м) Varisco, 25 шт. | 19764,48 | 1976,45 | 988,22 |
| 5 | Дизель-генератор ДГ-125, инв. № 1389 | 7872,00 | 787,20 | 393,60 |
| 6 | Пластиковый контейнер на 1000 л б/у, 3 шт.; емкость пластиковая 1000 л, 1 шт.; емкость пластиковая 1000 л, 2 шт.; емкость пластиковая 1000 л, 2 шт. | 844,80 | 84,48 | 42,24 |
| 7 | Ящик для пропановых баллонов, 2 шт.; ящик для песка «Каланча» 0,50 м³, 2 шт. | 130,56 | 13,06 | 6,53 |
| 8 | Полуавтомат Magster-280 4*4 (B18228-1), инв. № 2395; сварочный агрегат ВД-401, инв. № 728 | 1065,60 | 106,56 | 53,28 |
| 9 | Трансформатор сварочный TECHNOLOGY 175 HD в кейсе, инв. № 1617; сварочный аппарат MMA-200 LUX ELAND б/у, инв. № 1615; инвертор сварочный HDC Atlanta 200, инв. № 2785 | 380,16 | 38,02 | 19,01 |
| 10 | Кровать металлич., 15 шт.; кровать метал. КМП-1-1.00.000-02, 2 шт. | 718,08 | 71,81 | 35,90 |
| 11 | Электронасос «Гном» 6-10 Д 220В, инв. № 2822; насос «Бурун» Н1ВБ2,5/2 380В +Н1В2,5/2 «Бурун Обойма» 23ТНП12 000,011, инв. № 2682 | 432,00 | 43,20 | 21,60 |
| 12 | Холодильник «МИНСК-15» /ПТО/, инв. № 19; телевизор «Горизонт»-37\664, инв. № 416; холодильник, инв. № 429; холодильник МХМ 2835, инв. № 703; холодильник-1320, инв. № 894; холодильник МХ М2823-80, инв. № 665; телевизор «Горизонт»-37\664, инв. № 416; телевизор «Горизонт»21А20, инв. № 418; холодильник «Атлант», инв. № 2530; холодильник МХМ 2823-80, инв. № 904 | 368,64 | 36,86 | 18,43 |
| 13 | Компьютер в сборе /ПЭВМ ENERGY монитор Philips/, инв. № 1685 | 58,56 | 5,86 | 2,93 |
| 14 | Контейнер для ТБО 02 Б М*-17004/01; контейнер для ТБО 02 Б М*-17004/01; контейнер для ТБО 01К | 201,60 | 20,16 | 10,08 |
| 15 | Сейф металлический, 2 шт.; сейф металлический; сейф | 233,28 | 23,33 | 11,66 |
| 16 | Щит 3000*750*100, 3 шт.; щит 3300*1000*100; щит 2700*740*100; щит 2700*750*100; щит 3000*900*100; щит 3000*800*100; щит 3300*1350*100, 6 шт.; щит 3300*300*100; щит опалубочный ЩК 1350*3300С, 46 шт.; щит опалубочный ЩК 300*3300С, 4 шт.; щит опалубочный ЩК 300*3300Уг, 8 шт.; щит опалубочный Щк 600*3300С, 5 шт.; щит опалубочный ЩК 900*3300Ун, 5 шт.; щит линейный «Гелиос-Армада ST-120» 0,78х3,0, 1 шт.; щит угловой внутренний «Гелиос-Армада ST-120» 0,3х3,0, 4 шт.; щит 3000*200*100; щит линейный «Гелиос-Армада ST-120» 0,3х3,0; подпорный раскос оцинк., 8 шт.; щит 3000*450*100; щит 3000*600*100, 2 шт.; щит 3000*500*100, 4 шт.; щит угловой внутренний 0,3х0,3х3,0, 4 шт.; щит опалубочный ЩК 1350*3300С, 46 шт. | 10441,92 | 1044,19 | 522,10 |
| 17 | Фундамент Ф-1; двуконусный блок 30*30 Н300, 2 шт.; ПДн 10, 6 шт.; ПДн 10 | 288,19 | 28,82 | 14,41 |
| 18 | Туалетная кабина МТК «Стандарт» Ecogr (зеленый) в разборе, инв. № 2763; туалетная кабина «СтандартЭС+», инв. № 2751; кабина уличная «Стандарт» зеленая, инв. № 2572 | 595,20 | 59,52 | 29,76 |
| 19 | Туалетная кабина «СтандартЭС+», инв. № 2750; туалетная кабина МТК «Стандарт» Ecogr (зеленый) в разборе, инв. № 2761; биотуалет MTK EcoGR «Ecoslylo» в сборе, инв. № 2866; биотуалет MTK EcoGR Ecostyle в разборе (зеленый), инв. № 2915 | 883,20 | 88,32 | 44,16 |
| 20 | Кузов К-375, инв. № 204; кузов К-375, инв. № 112; инструменталка, инв. № 372; кузов -375, инв. № 64; кунг, инв. № 1744 | 1660,80 | 166,08 | 83,04 |
| 21 | Стол обеденный МБ-16 1104х604х745; стол обеденный МБ-16 1104х604х745; электрич. варочная панель «Гефест» СВН 3210 К17, 2 шт., инв. № 18142; тумба кухонная, 2 шт.; тумба кухонная | 209,28 | 20,93 | 10,46 |
| 22 | Тумба стационарная ТС-04; тумба стационарн. 400*600*750; тумбочка /бук/, 3 шт. | 264,00 | 26,40 | 13,20 |
| 23 | Электродвигатель 30кВт б/у, инв. № 2416; труба эл/св 38,0х2,5, 2 шт.; вибронаконечник, инв. № 1094 | 1305,60 | 130,56 | 65,28 |
| 24 | Инструменталка, инв. № 744 | 816,00 | 81,60 | 40,80 |
| 25 | Кунг автомобильный, инв. № 1101 | 480,00 | 48,00 | 24,00 |
| 26 | Вагон-бытовка №7, инв. № 2446; вагон-бытовка № 6, инв. № 2445 | 3648,00 | 364,80 | 182,40 |
| 27 | Инструменталка, инв. № 2439 | 489,60 | 48,96 | 24,48 |
| 28 | Инструменталка, инв. № 747 | 816,00 | 81,60 | 40,80 |
| 29 | Инструменталка, инв. № 1788 | 816,00 | 81,60 | 40,80 |
| 30 | Вагон-бытовка, инв. № 1312 | 960,00 | 96,00 | 48,00 |
| 31 | Бытовка строительная, инв. № 2396 | 892,80 | 89,28 | 44,64 |
| 32 | Инструменталка, инв. № 613 | 816,00 | 81,60 | 40,80 |
| 33 | Инструменталка, инв. № 523 | 816,00 | 81,60 | 40,80 |
| 34 | Кунг-бытовка, инв. № 509 | 480,00 | 48,00 | 24,00 |
| 35 | Инструменталка, инв. № 1705 | 816,00 | 81,60 | 40,80 |
| 36 | Инструменталка, инв. № 1424 | 816,00 | 81,60 | 40,80 |
| 37 | Инструменталка /Склад для инструмента № 7/, инв. № 2459 | 816,00 | 81,60 | 40,80 |
| 38 | Инструменталка /Склад для инструмента № 5/, инв. № 2413 | 489,60 | 48,96 | 24,48 |
| 39 | Инструменталка, инв. № 1026 | 816,00 | 81,60 | 40,80 |
| 40 | Инструменталка, инв. № 1275 | 816,00 | 81,60 | 40,80 |
| 41 | Станок деревообр. К-5-400, инв. № 449 | 2400,00 | 240,00 | 120,00 |
| 42 | Инструменталка, инв. № 746 | 489,60 | 48,96 | 24,48 |
| 43 | Инструменталка, инв. № 2409 | 422,40 | 42,24 | 21,12 |
| 44 | Инструменталка, инв. № 1803 | 710,40 | 71,04 | 35,52 |
| 45 | Бытовка строительная № 1, инв. № 2390 | 1536,00 | 153,60 | 76,80 |
| 46 | Инструменталка, инв. № 2405 | 566,40 | 56,64 | 28,32 |
| 47 | Инструменталка, инв. № 2406 | 960,00 | 96,00 | 48,00 |
| 48 | Бытовка Кунг на шасси, инв. № 2467 | 748,80 | 74,88 | 37,44 |
| 49 | Вагон-дом, инв. № 115 | 1536,00 | 153,60 | 76,80 |
| 50 | Кунг, инв. № 900 | 480,00 | 48,00 | 24,00 |
| 51 | Блок-контейнер 6*2,45, инв. № 1955 | 748,80 | 74,88 | 37,44 |
| 52 | Вагон-бытовка № 7, инв. № 2457 | 960,00 | 96,00 | 48,00 |
| 53 | Инстументалка /Склад для инструмента /, инв. № 2538 | 489,60 | 48,96 | 24,48 |
| 54 | Блок-контейнер, инв. № 493 | 748,80 | 74,88 | 37,44 |
| 55 | Инструменталка, инв. № 503 | 960,00 | 96,00 | 48,00 |
| 56 | Блок-контейнер Вариант В-1-2, инв. № 729 | 960,00 | 96,00 | 48,00 |
| 57 | Блок-контейнер «В», инв. № 601 | 576,00 | 57,60 | 28,80 |
| 58 | Блок-модуль CU-85, инв. № 845 | 393,60 | 39,36 | 19,68 |
| 59 | Инструменталка, инв. № 1103 | 816,00 | 81,60 | 40,80 |
| 60 | Вагон-дом ЭРУП-5, инв. № 352 | 422,40 | 42,24 | 21,12 |
| 61 | Вагон-дом ЭРУП-5, инв. № 353 | 960,00 | 96,00 | 48,00 |
| 62 | Кунг-бытовка, инв. № 510 | 480,00 | 48,00 | 24,00 |
| 63 | Инструменталка, инв. № 369 | 816,00 | 81,60 | 40,80 |
| 64 | Кунг К-375 отразд \РЛ 35\, инв. № 310 | 480,00 | 48,00 | 24,00 |
| 65 | Инструменталка, инв. № 1772 | 816,00 | 81,60 | 40,80 |
| 66 | Инструменталка, инв. № 924 | 816,00 | 81,60 | 40,80 |
| 67 | Вагон-бытовка, инв. № 1903 | 1248,00 | 124,80 | 62,40 |
| 68 | Сушилка для обуви конвективная СОК-30, инв. № 2679 | 681,60 | 68,16 | 34,08 |
| 69 | Бензопила Stihl MS361 шина цепь, 37 см защитный кожух, инв. № 2389 | 643,20 | 64,32 | 32,16 |
| 70 | Стеллаж архивно-складской, 5 шт. | 326,40 | 32,64 | 16,32 |
| 71 | Инструменталка, инв. № 742 | 816,00 | 81,60 | 40,80 |
| 72 | Инструменталка, инв. № 511 | 816,00 | 81,60 | 40,80 |
| 73 | Инструменталка, инв. № 1391 | 816,00 | 81,60 | 40,80 |
| 74 | Шкаф комбинированный Ш15, 11 шт. | 1161,60 | 116,16 | 58,08 |
| 75 | Тумба прикроватная 11Т010,, 16 шт. | 783,36 | 78,34 | 39,17 |
| 76 | Инструменталка, инв. № 1276 | 816,00 | 81,60 | 40,80 |
| 77 | Вагон-бытовка, инв. № 1992 | 960,00 | 96,00 | 48,00 |
| 78 | Инструменталка, инв. № 2175 | 816,00 | 81,60 | 40,80 |
| 79 | Инструменталка, инв. № 1104 | 816,00 | 81,60 | 40,80 |
| 80 | Инструменталка, инв. № 1391 | 816,00 | 81,60 | 40,80 |
| 81 | ФБС 24.3.6 Н, 12 шт.; ФБС 12.3.6-Н, 1 шт.; ФБС 24.4.6 Н, 11 шт.; ФБС 24.4.6 Н, 10 шт.; ФБС 12.4.6 Н, 1 шт.; ФБС 12.4.6 Н, 5 шт.; ФБС 12.4.3 Н, 18 шт.; ФБС 12.3.6 Н, 12 шт.; ФБС 12.3.6 Н, 1 шт.; ФБС 9.4.6 Н, 5 шт.; ФБС 9.4.6 Н, 1 шт.; ФБС 24.3.6 Н, 2 шт.; ФБС 12.4.6-Н, 9 шт. | 1739,52 | 173,95 | 86,98 |
| 82 | Холодильник «Атлант» МХМ-2835-90, инв. № 2776; холодильник-морозильник ХМ-4012-000 РБ, инв. № 1339; холодильник МРМ-46-CJ, инв. № 2480; холодильник «Атлант» -морозильник ХМ-4010-022, инв. № 2775; печь микроволновая «Горизонт» 20MW700-1378В, инв. № 12718; холодильник МХ-2823-80, инв. № 609; холодильник МХМ 2808-97, инв. № 1878; холодильник МХ М2706-80, инв. № 674 | 882,24 | 88,22 | 44,11 |

В отношении вышеуказанного имущества проводятся вторые повторные торги. Стоимость снижена на 20 %. Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 252 (29874) от 23.12.2022, стр. 15, № 23 (29903) от 04.02.2023, стр. 14

**Местонахождение лотов №№ 1–3, 5–23, 34–77, 79–82:** Минская обл., Минский р-н, пос. Боровляны, ул. 40 лет Победы, 19; **лотов №№ 4, 78:** Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, пос. Опытный, ул. Лагерная, 20; **лотов №№ 24–33:** Минская обл., Минский р-н, пос. Сокол

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **14 марта 2023 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **с 10.00 1 марта 2023 года до 16.00 10 марта 2023 года** |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ», проводимых 14.03.2023.

2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр.лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.

